Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
7 ЖНІЎНЯ 2013 г. СЕРАДА № 145 (27510) Кошт 1600 рублёў
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Карэспандэнт «Звязды» пабываў на спаборніцтвах па спартыўнай лоўлі ракаў у Полацкім раёне. За тры хвіліны голымі рукамі іх трэба было злавіць як мага больш. А знайсці на дне рака не так і проста... СТАР. 4



«Самае складанае — увесь час канцэнтраваць увагу на маніторы і быць вельмі сабранай». Журналіст «Аховы» правёў суткі разам з дзяжурнай зменай пункта цэнтралізаванага назірання Дэпартамента аховы МУС. СТАР. 5

*ЛІЧБА ДНЯ*

**2 млн 239 тыс.**

*маладых грамадзян (ва ўзросце ад 14 да 31 года) жылі ў рэспубліцы на 1 студзеня гэтага года. Гэта 23,7% ад агульнай колькасці насельніцтва краіны. Амаль 83% беларускай моладзі складаюць гараджане. Пераважная большасць моладзі (82,7%) пражывае ў гарадах і пасёлках гарадскога тыпу, у сельскай мясцовасці — 17,3%. Каля 38% ад агульнай колькасці моладзі рэспублікі пражывае ў Мінску і Мінскай вобласці (847,1 тыс. чалавек), менш за ўсё моладзі ў Магілёўскай (10,9%) і Гродзенскай (10,6%) абласцях.*

## КОРАТКА

«Беларусбанк» на нявызначаны тэрмін прыпыніў прыём заяў ад грамадзян на выдачу крэдыту на нерухомую маёмасць пад 14 працэнтаў і 16 працэнтаў. Тыя, хто паспеў заключыць дагавор да 2 жніўня, будуць пракрэдытаваны ў поўным аб'ёме.

З 20 жніўня 2013 года уступіць у сілу новая інструкцыя аб парадку рэгістрацыі даменных імёнаў у зоне BY.

Беларускім дамам-інтэрнатам плануюць дазволіць рэалізацыю вырабаў іх майстэрань. Размова аб вырабах, што зроблены ў лячэбна-працоўных майстэрнях, — прадукцыя бытавога прызначэння, розныя мастацкія вырабы.

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 7.08.2013 г.

| | |
|---|---|
| Долар ЗША | 8910,00 ▲ |
| Еўра | 11810,00 ■ |
| Рас. руб. | 270,50 ■ |
| Укр. грыўня | 1095,60 ▲ |

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 34° |
| Віцебск | + 29° |
| Гомель | + 31° |
| Гродна | + 34° |
| Магілёў | + 31° |
| Мінск | + 31° |

ISSN 1990 - 763X

# Веткаўскі ўраджай



Фота БЕЛТА.

Кедравую дзялянку ў Веткаўскім раёне заклаў мясцовы жыхар і энтузіяст Генадзь Асанаў, які прывёз насенне з Новасібірскага аддзялення Акадэміі навук 36 гадоў таму. На кедравай плантацыі былі высаджаны тры гатункі кедраў — сланцавы, карэйскі і сібірскі. Першае кедравае насенне (арэшкі) з'явіліся толькі праз 33 гады пасля высадкі кедраў, а сёлета работнікі Веткаўскага спецлясгаса збіраюць сапраўдны ўраджай — каля ста кілаграмаў кедравых шышак ужо сабрана з 22 дрэў.

На фота: Генадзь АСАНАЎ (у цэнтры) і работнікі Веткаўскага спецлясгаса — майстар лесу Сяргей КУЗЬМЯНКОЎ (справа) і ляснік Максім МАСТАБАЙ.

## ЗМЯНЕННІ Ў ВЫБАРЧЫМ ЗАКАНАДАЎСТВЕ: УЗВАЖАНАСЦЬ І ТОЛЬКІ Ў ІНТАРЭСАХ БЕЛАРУСКАГА НАРОДА

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правёў учора нараду па пытаннях удасканалення выбарчага заканадаўства, перадае БЕЛТА.**

Адкрываючы нараду, кіраўнік дзяржавы адзначыў: «Як і дамаўляліся ў студзені, мы яшчэ раз сустракаемся і абмяркоўваем пытанні ўдасканалення выбарчага заканадаўства. Я лічу, сённяшняя размова будзе канчатковай перад унясеннем праекта закона ў парламент».

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, у гэтым праекце знайшлі адлюстраванне адобраныя на нарадзе прапановы па аптымізацыі выбарчага працэсу.

«Паколькі праектам закона закранаюцца вельмі важныя для выбарчай сістэмы пытанні, рашэнне аб неабходнасці яго ўнясення ў Палату прадстаўнікоў у прапанаванай рэдакцыі павінна быць максімальна прадуманым», — лічыць Прэзідэнт. Пры гэтым кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што неабходна ўлічыць усе магчымыя наступствы прапануемых мер і дакладна ўяўляць сабе механізм іх рэалізацыі. «Калі мы ідзём на нейкае паслабленне, то павінны быць упэўнены, што гэта не паўплывае негатыўна на стабільнасць у краіне і кіруемасць сітуацыяй у час выбараў», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. СТАР. 2

■ Парламенцкі дзённік

## ЗАКОН ДЛЯ КАНКУРЭНЦЫІ

Восенню будуць разгледжаны законапраекты, накіраваныя на зніжэнне кошту паслуг сотавай сувязі, пошты і авіяпералётаў

**На пачатак жніўня ў Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі знаходзілася 8 законапраектаў, з іх 2 рыхтуюцца да першага чытання і 6 — да другога. Пра асноўныя новаўвядзенні, якія змяшчаюць будучыя законы, «Звяздзе» расказаў старшыня Камісіі Дзмітрый ХАРЫТОНЧЫК.**

### Службовая інфармацыя

Закон аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у закон аб інфармацыі, інфарматызацыі і абароне інфармацыі быў унесены ў парламент 1 лістапада 2012 года, а 30 мая ён быў прыняты ў першым чытанні. У ім упершыню на заканадаўчым узроўні рэгулююцца пытанні аб службовай інфармацыі абмежаванай распаўсюджанасці.

«Закон вызначае, што адносіцца да такой інфармацыі, і дае пералік дакладных падстаў для забароны прадстаўлення інфармацыі, — патлумачыў Дзмітрый Харытончык. — Праект закона таксама прапісвае абавязковасць прадстаўлення пераліку закрытай або абмежаванай інфармацыі для грамадзян, гэта значыць, кожны зможа ўбачыць, якая інфармацыя для яго закрыта, а якая — не».

Законапраект удасканальвае спосабы прадстаўлення інфармацыі, прадпісвае дзяржаўным органам размяшчаць сваю інфармацыю на ўласных сайтах у інтэрнэце. Акрамя таго, грамадзянам даецца права атрымліваць інфармацыю (якая не змяшчае абмежаванага доступу) непасрэдна на пасяджэннях выканкамаў.

Праект закона таксама мае вызначэнне «асабістых даных» грамадзян, парадак іх прадстаўлення і карыстання імі. СТАР. 3

## ЖАНЧЫНЫ РУЛЯЦЬ

У МАГІЛЁЎСКАЙ ВОБЛАСЦІ ЗА РУЛЬ ДЗЕСЯЦІ НОВЫХ ШКОЛЬНЫХ АЎТОБУСАЎ СЯДУЦЬ ЖАНЧЫНЫ

**Напрыканцы звычайнага працоўнага дня ў аб'яднанай тэхнічнай школе № 1 Добраахвотнага таварыства садзейнічання арміі, авіяцыі і флоту ў Магілёве пачынаюцца заняткі для вадзіцеляў. Клас, дзе вучаць на катэгорыю «Д», поўны слухачоў, і сярод мужчын — пяць жанчын рознага ўзросту, якія старанна нешта запісваюць пра «крывашыпна-шатунны механізм». Яны — будучыя кіроўцы школьных аўтобусаў у сельскіх раёнах Магілёўскай вобласці.** СТАР. 3



Ганна Бекмансурава і інструктар Сяргей Шляхтаў: «Вялікія габарыты — гэта не страшна, а цікава!»

# ЗМЯНЕННІ Ў ВЫБАРЧЫМ ЗАКАНАДАЎСТВЕ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Пры гэтым ён адзначыў, што «ніякага самавольства і бескантрольнасці быць не павінна».

Кіраўнік дзяржавы прадоўжыў: «Ведаю, што шэраг палажэнняў праекта падтрыманы не ўсімі. Пярэчанні выклікаюць нормы аб змяненні парадку фінансавання выбарчых кампаній кандыдатаў. У прыватнасці, аб павелічэнні памераў выбарчых фондаў і магчымасці іх стварэння на этапе вылучэння кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь яшчэ да рэгістрацыі кандыдатаў».

У сувязі з гэтым Аляксандр Лукашэнка прапанаваў калегіяльна абмеркаваць законапраект у цэлым і яго асобныя палажэнні, якія выклікаюць рознагалоссі сярод удзельнікаў нарады. «Каб прыняць узважаныя рашэнні, якія ў поўнай меры адпавядаюць інтарэсам беларускай дзяржавы, мы сёння і сабраліся», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Пры гэтым Прэзідэнт папрасіў: «Давайце не будзем рабіць нейкія скачкі, каб бегчы з кімсьці навыперадкі, давайце не будзем падганяць час і пастараемся ісці ў нагу з падзеямі і асабліва сталасцю нашага грамадства. І давайце будзем вырашаць тыя пытанні, якія сёння наспелі, не выдумваючы нейкіх новых, спасылаючыся на новыя дэмакратычныя або старыя дэмакратычныя дзяржавы і працэдуры».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: «Мы жывём у сваёй краіне, ёсць праблема, ёсць пытанне — давайце вырашаць. Няма праблемы, няма пытання — давайце не будзем ствараць гэтыя праблемы і пытанні».

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што крытэрый адзін: «Выбары, іншыя кампаніі праходзяць у Беларусі для беларускага народа і ў імя гэтага народа. І вырашаць гэтыя праблемы, якія мы сёння будзем абмяркоўваць, павінен беларускі народ. Мы павінны ўсё рабіць так, як сёння жадае народ, які жыве ў нашай краіне. Гэта галоўнае».

# ІНВЕСТЫЦЫІ: НЕ ЧАКАННЕ, А СТВАРЭННЕ ДЛЯ ІХ УСІХ УМОЎ

**Закон Рэспублікі Беларусь «Аб інвестыцыях», які ўступае ў сілу ў студзені будучага года і заменіць дзеючы пакуль што Інвестыцыйны кодэкс, уносіць сур'ёзныя змены ў існуючую сістэму прававога рэгулявання інвестыцыйнай дзейнасці. Пра гэта ўчора ішла гаворка на брыфінгу для журналістаў у Міністэрстве эканомікі.**

Закон «Аб інвестыцыях», паведаміў начальнік галоўнага ўпраўлення інвестыцый Мінэканомікі Сяргей Вайцяхоўскі, павінен стаць асновай для стварэння новага механізму прыцягнення інвестыцый, паколькі існуючыя падыходы з часам сталі патрабаваць карэкціроўкі. Закон дэкларуе, што дзяржава гатова не на словах, а з дапамогай заканадаўчых асноў і гарантый забяспечваць неабходны прыток укладанняў у эканоміку.

Новы закон, які, дарэчы, стварыўся ў цесным супрацоўніцтве з экспертамі Міжнароднай фінансавай карпарацыі, а таксама са спецыялістамі з ЗША, Швецыі і Аўстрыі, пералічвае асноўныя прынцыпы прыцягнення інвестыцый, якія адпавядаюць міжнароднай практыцы: вяршэнства права, роўнасць айчынных і замежных інвестараў, добрасумленнасць і разумнасць ажыццяўлення інвестыцый, а таксама забеспячэнне аднаўлення парушаных правоў і законных інтарэсаў, судовую абарону. Надзвычай важна, што пры ажыццяўленні інвестыцый прызнаецца прыярытэт агульнапрызнаных прынцыпаў міжнароднага права.

Асаблівасцямі Закона «Аб інвестыцыях» з'яўляецца дэталізацыя правоў інвестараў, істотна пашыраны пералік магчымых інвестыцый. Паводле новага дакумента, інвестары пры неабходнасці змогуць вырашаць спрэчныя пытанні ў міжнародных арбітражных інстанцыях.

Знайшла ў новым дакуменце адлюстраванне і такая сусветная тэндэнцыя, як магчымасць прыцягваць рабочую сілу з-за мяжы. Цяпер інвестары змогуць пры неабходнасці працаўладкоўваць замежных грамадзян і асоб без грамадзянства для ажыццяўлення працоўнай дзейнасці ў нашай краіне.

Нават самае дасканалае заканадаўства не з'яўляецца гарантыяй таго, што не можа наступіць выпадак, калі ўзнікне пытанне нацыяналізацыі або рэквізіцыі (канфіскацыі). Таму прадугледжана, што нацыяналізацыя магчыма толькі па матывах грамадскай неабходнасці і пры ўмове своечасовай і поўнай кампенсацыі кошту маёмасці, якая нацыяналізуецца. Вельмі істотна, што парадак і ўмовы нацыяналізацыі, а таксама выплаты кампенсацыі вызначаюцца ў кожным выпадку асобным законам. Гэта, на думку распрацоўшчыкаў, таксама вельмі важнае новаўвядзенне.

Сяргей Вайцяхоўскі падкрэсліў, што да ўступлення новага закона ў дзеянне ў краіне будзе выканана вялікая работа па прывядзенні ў адпаведнасць з ім існуючай заканадаўчай базы.

Ён адзначыў таксама, што сёлета ў краіне назіраецца прыток замежных інвестыцый: пры прагнозе на год у 2 мільярды долараў з пачатку года рэальны сектар, сельская гаспадарка і фінансавая сфера ўжо атрымалі 1,5 мільярда.

**Пятро РАМАНЧУК.**

# НАЯЎНЫ ПЛАЦЕЖ ДЛЯ НАСЕЛЬНІЦТВА АБМЯЖУЮЦЬ 150 млн



Фота Пятра ФАМІНА.

**Пытанне аб лімітаваным памеры плацяжу пры ажыццяўленні насельніцтвам аплаты тавараў, работ і паслуг разглядалася на пашыраным пасяджэнні праўлення Нацбанка. Па ўзгадненні з зацікаўленымі органамі дзяржаўнага кіравання на зацвярджэнне будзе вынесены гранічны памер у суме 1500 базавых велічынь, у эквіваленце каля 17,5 тыс. долараў, звыш якога аплата павінна будзе ажыццяўляцца толькі ў безнаяўнай форме. Аб гэтым паведамілі рэдакцыі ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў Нацыянальнага банка Беларусі.**

Пры падрыхтоўцы пытання прымаўся да ўвагі вопыт суседніх дзяржаў. У Расіі такі ліміт плануецца ўсталяваць у памеры 600 тыс. расійскіх рублёў, або каля 20 тыс. долараў; ва Украіне ён ужо устаноўлены ў памеры 150 тыс. грыўняў, або каля 18 тыс. долараў, адзначылі ў Нацбанку.

Развіццё безнаяўных разлікаў, падкрэслівалася на пасяджэнні, з'яўляецца найважнейшым элементам рэгулявання грашова-крэдытнай сферы, якія спрыяюць павышэнню эфектыўнасці рэалізацыі манетарнай палітыкі.

Нагадаю, што летась Нацбанк выступіў з ініцыятывай падрыхтоўкі і зацвярджэння плана сумесных дзеянняў дзяржаўных органаў і ўдзельнікаў фінансавага рынку па развіцці ў краіне сістэмы безнаяўных разлікаў па розничных плацяжах з выкарыстаннем сучасных электронных плацежных інструментаў і сродкаў плацяжу на 2013—2015 гады. «На 1 ліпеня сёлета доля безнаяўнага грашовага абароту ў рознічным тавараабароце дасягнула 15,7%, павялічыўшыся на 2,5% за першае паўгоддзе. Пры гэтым прырост за 2011 год склаў 1,4%, за 2012 — 3,7%, а гэта сведчыць аб тым, што нават першапачатковыя арганізацыйныя мерапрыемствы дазволілі павялічыць тэмпы прыросту», — канстатавалі ў Нацбанку.

Мэтавыя арыенціры дынамікі росту долі безнаяўнага грашовага абароту ў рознічным тавараабароце і аб'ёме платных паслуг насельніцтву да 1 студзеня 2016 года вызначаны на ўзроўні 50%, паведамляе Нацыянальны банк краіны.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# «БЕЛЛЕГПРАМ»: ШЛЯХ ДА РЭНТАБЕЛЬНАСЦІ

**На базе прадпрыемстваў «Белвест» і «Марка» плануецца стварыць холдынгі. Праекты нарматыўных актаў ужо на стадыі дапрацоўкі. Пра гэта паведаміў учора Сяргей Місурагін, першы намеснік кіраўніка канцэрна «Беллегпрам». Пакуль падрабязнасці інтэграванага падыходу невядомыя, але пра дамінантную ролю названых прадпрыемстваў сцвярджаць можна. Захады арганізаваць абутковыя холдынгі рабіліся яшчэ летась у лістападзе. Аднак на той момант гэтыя праекты ажыццявіць было немагчыма.**

Сітуацыя са стварэннем трыкатажнага холдынга прасцейшая, чым з абутковым. На стадыі аб'яднання — «Світанак», «Купалінка», «КІМ» і «Брэсцкі панчошны камбінат». Наконт «дзяржаўнасці» апошняга зараз узнікаюць сур'ёзныя сумневы: на 79% прадпрыемства стала прыватным. Два буйныя інвестары маюць дыяметральна розныя погляды на бізнес-планаванне. Дзеля вырашэння складанага становішча «Беллегпрам» намагаецца перадаць долю «Брэсцкага панчошнага камбіната» «Світанку».

Сяргей Місурагін адказаў таксама на пытанні наконт павелічэння на складах запасаў прадукцыі, удзельны кошт якой дасягае двух трыльёнаў долараў. Плануецца кардынальна знізіць запасы да чацвёртага квартала, у тым ліку праз рэкламныя акцыі і дапамогу арганізацый Мытнага саюза. Паводле яго слоў, гэтая праблема хоць і з'яўляецца пастаяннай, але мае сезонны характар. Так, пік запасаў прадукцыі на складах заўжды прыпадае на першае ліпеня, але з пачаткам жніўня можна смела канстатаваць іх істотнае зніжэнне. Беларусы прыязджаюць з летняга адпачынку, збіраюць дзяцей у школу і, вядома ж, купляюць беларускае.

Купляюць беларускае не толькі беларусы. Больш як 50% прадукцыі «Беллегпрама» ідзе на экспарт. У першую чаргу маецца на ўвазе Расія, але ўзрастае і роля новых рынкаў. Айчынная вопратка і абутак распаўсюджваюцца ў Лацінскай Амерыцы і Паўднёва-Усходняй Азіі.

19% ад агульнай колькасці складаюць непрыбытковыя прадпрыемствы, сярод якіх у першую чаргу Барысаўская і Баранавіцкая швейныя фабрыкі. Тым не менш, абсалютная большасць з'яўляецца рэнтабельнай. Так, бясспрэчнае лідарства замацавалася за Аршанскім ільнокамбінатам. Для маштабнай рэканструкцыі апошняга знойдзены новыя крыніцы. Сёння прадпрыемства застаецца найлепшым экспарцёрам: за мяжу ідзе больш за 70% яго прадукцыі.

Летась вострая праблема Брэсцкага дыванновага завода страціла актуальнасць. Прадпрыемства выйшла і зараз своечасова выдае заробкі. «Дываны з высокім ворсам чакаюць сваіх пакупнікоў», — адзначае Сяргей Місурагін.

**Маргарыта СІДАР.**

## ■ Факт

### «ТРОХТЫСЯЧНІКІ» З АЛЕКСАНДРЫІ

**Сямейны экіпаж Міхаіла і Сяргея Байдаковых з адкрытага акцыянернага таварыства «Александрыйскае» Шклоўскага раёна намалацілі больш за 3 тысячы тон збожжа. Гэтую мяжу таксама перасягнуў і экіпаж Уладзіміра і Дзмітрыя Мельнікавых з агракамбіната «Зара» Магілёўскага раёна, якіх напрыканцы мінулага тыдня ўшаноўвалі як першых «двухтысячнікаў» у Магілёўскай вобласці.**

Такім чынам, цяпер у рэгіёне два экіпажы камбайнераў, якія сталі ўжо «трохтысячнікамі». З'явіўся і першы «трохтысячнік»-вадзіцель — Дзяніс Латыпаў з ААТ «Александрыйскае».

У «Александрыйскім» ураджайнасць складае цяпер 76 цэнтнераў з гектара, а Шклоўскі раён — лідар па ўраджайнасці сёлетняга жніва ў Магілёўскай вобласці. На Шклоўшчыне збіраюць у сярэднім 53 цэнтнеры з гектара. Увогуле ў Магілёўскай вобласці ўбралі больш за 60% пасяўных плошчаў, намалочана больш за 760 тысяч тон збожжа.

**Ілона ІВАНОВА.**

### ЗАЛАТАЯ МАНЕТА «СЛАВЯНКА»

**Нацыянальны банк Беларусі ў жніўні ўвёў у абарачэнне залатую інвестыцыйную (зліткавую) манету «Славянка» наміналам 50 рублёў, пробай сплаву 999,9, масай 7,78 г, дыяметрам 22,00 мм.**

Манета адчаканена афінажным прадпрыемствам Valcambi (Швейцарыя), якасцю «анцыркулейтэд», тыражом да 100 000 штук. Выпушчаная ў абарачэнне манета з'яўляецца законным плацежным сродкам Беларусі, абавязковым да прыёму па намінальным кошце пры ўсіх відах плацяжоў без усялякіх абмежаванняў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

### УКУСІЎ... ІНСПЕКТАРА ДАІ

Увагу супрацоўнікаў ДАІ ў вёсцы Агова Іванаўскага раёна прыцягнуў скутарыст, які вёз непаўналетнюю пасажырку без шлема. Яму загадалі спыніцца. Аднак парушальнік праігнараваў сігнал інспектара, паехаў далей і спыніўся ў двары аднаго з дамоў. Яго дагналі і папрасілі паказаць дакументы. Але вадзіцель скутара адмовіўся паказваць правы і ісці да патрульнай машыны. Больш за тое, ён аказаў супраціўленне і ўкусіў інспектара за руку. Апошняму давялося звяртацца па медыцынскую дапамогу.

На скутарыста аформлена шэсць адміністрацыйных пратаколаў, заведзена крымінальная справа за нанясенне цялесных пашкоджанняў. Хулігану пагражае да шасці гадоў пазбаўлення волі.

**Яна СВЕТАВА.**

### «ПРАСПІРТАВАНЫ» АЎТОБУС

**У сталіцы ў аўтобусе міжнароднага маршруту канфіскаваны нелегальны спірт.**

Супрацоўнікі ўпраўлення па раскрыцці цяжкіх эканамічных злачынстваў ГУУС Мінгарвыканкама разам з калегамі з АБЭЗ Савецкага РУУС Мінска, сталічнай Дзяржаўтаінспекцыі і падатковымі інспектарамі на вуліцы Бабруйскай затрымалі міжнародны аўтобус «Мінск — Санкт-Пецярбург», у тайнікy багажнага аддзялення якога перавозілася спіртазмяшчальная прадукцыя ў ёмістасцях па 4,5 літра. Аб'ём грузу склаў 300 літраў агульным коштам каля 40 мільёнаў рублёў. Як высветлілася, спіртное належала 51-гадоваму кіроўцу аўтобуса. У дачыненні да яго складзены адміністрацыйны пратакол. Парушальніку пагражае штраф да 10 мільёнаў рублёў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

### МАГНІТНЫЯ ПОЛЮСЫ СОНЦА ПАМЯНЯЮЦЦА МЕСЦАМІ



Паўночны і паўднёвы магнітныя полюсы Сонца ў хуткім часе памяняюцца месцамі, паведамляюць інфармагенцтвы. Гэта адбываецца кожны раз, калі сваціла аказваецца на піку 11-гадовага цыкла актыўнасці. Як паведамляюць спецыялісты NASA, да змены палярнасці застаецца не больш за тры-чатыры месяцы. Даныя з сонечных абсерваторый паказваюць, што цяпер паўшар'і Сонца рухаюцца да гэтага «пераключэння» не сінхронна: хутчэй падрыхтаваўся паўночны полюс, паўднёвы яго даганяе.

Працэсы, якія адбываюцца на Сонцы, выклікаюць хвалевы эфект па ўсёй Сонечнай сістэме. На піку актыўнасці на Сонцы значна часцей адбываюцца ўспышкі і з'яўляюцца «каранальныя дзіркі» — вобласці з павышанай хуткасцю сонечнага ветру. Гэта прыводзіць і да выкідаў плазмы, што становіцца прычынай магнітных бур на Зямлі. ■

20 августа 2013 г. в 12.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Полесьежилстрой».

Повестка дня:

1. О совершении сделок Общества.

Местонахождение ОАО «Полесьежилстрой»: г. Брест, ул. Кижеватова, 60.

Место проведения собрания: г. Брест, ул. Кижеватова, 60.

Время регистрации в день проведения собрания с 11.30 до 12.00.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера — доверенность).

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 13.08.2013 г. (с 10.00 до 16.00) по месту нахождения Общества.

УНП 200050191 Совет директоров.

Утерянные страховые полисы СООО «Белкоопстрах» по добровольному страхованию от несчастных случаев на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БМ №№ 0530022, 0565610, 0565611, квитанции о приеме наличных денежных средств формы 1-СУ серии КС 3935785, 3935786 **считать недействительными.**

УНП 100706519

# ЗАКОН ДЛЯ КАНКУРЭНЦЫІ

## Незваротныя авіябілеты

У восеньскую сесію плануецца прыняць законапраект аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Паветраны кодэкс. Асноўная навіна гэтага дакумента — вызначэнне прававога статусу эксперыментальнай авіяцыі.

«Змены прадыктаваны дынамічным развіццём будаўніцтва ў Беларусі беспілотных лятальных апаратаў, — сказаў старшыня парламенцкай камісіі. — Пакуль што ў законе не былі ўрэгуляваны ні вытворчасць, ні выпрабаванні, ні эксплуатацыя такіх апаратаў. Цяпер такі прабел будзе ліквідаваны. Законапраект вызначае, які павінен быць аператар беспілотнага лятальнага апарата, якія ён павінен мець дакументы, што з'яўляецца эксперыментальным палётам».

Праект закона прыводзіць наша заканадаўства ў адпаведнасць з патрабаваннямі міжнароднай арганізацыі грамадзянскай авіяцыі, што палегчыць супрацоўніцтва з замежнымі авіяперавозчыкамі.

Уводзіцца паняцце сістэмы «незваротных білетаў», каб абараніць нацыянальнага аператара ад страт. Дагэтуль турагенцтвы, якія загадзя браніравалі авіябілеты, маглі адмовіцца ад іх пакупкі, у выніку чаго самалёты ў пік сезона аказваліся напалову пустымі. Гэта адлюстроўвалася і на кошце білетаў, якія ўключаюць страхавыя ўзносы ад падобных страт. Цяпер, калі беларуская авіякампанія зможа прадаваць «незваротныя білеты», яны павінны быць больш таннымі, бо не будуць змяшчаць выдаткі на страхаванне ад страт. Зараз ідзе абмеркаванне долі такіх білетаў у рэйсе.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

## Кур'ерская пошта

Законапраект аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у закон аб паштовай сувязі распрацаваны на падставе правапрымальнай практыкі і падпісаных Беларуссю міжнародных дагавораў. Праект уводзіць новыя паняцці: «кур'ерская сувязь» і «кур'ерская паслуга».

«У праекце закона змешчаны шэраг нормаў, накіраваных на павышэнне канкурэнцыі ў сферы аказання паштовых паслуг, — лічыць дэпутат. — Напрыклад, значна абмяжоўваюцца выключныя правы нацыянальнага аператара і адкрываюцца большыя магчымасці для дзеяння прыватных аператараў».

## Закон аб метрапалітэне

Восенню плануецца разгледзець цалкам новы законапраект — аб гарадскім электрычным транспарце і метрапалітэне. Дагэтуль вышэйзгаданая сфера рэгулявалася толькі агульнымі законамі аб транспарце і падзаконнымі актамі.

«Адсутнасць базавага закона не дазваляла дакладна выбудаваць сістэму адносін у гэтай сферы, — сказаў Дзмітрый Харытончык. — Цяпер закон дасць асноўныя вызначэнні, дазволіць замацаваць правы і абавязкі заказчыка, аператара паслуг, перавозчыка і грамадзян».

Закон таксама прапіша асноўныя патрабаванні да ўстойлівай і бяспечнай работы транспартнай сістэмы. Адна з навін — дагаворныя адносіны паміж заказчыкам, якім выступае дзяржаўны орган (выканаўчы камітэт), і аператарам пасажырскіх перавозак. Аператар вызначае неабходнасць і дастатковасць пасажырскіх перавозак, напрамкі і колькасць маршрутаў. Абавязкі па ўтрыманні дарог, пасадачных станцый і прыпынкаў ускладаюцца на заказчыка. Кантроль за іх станам і эксплуатацыяй — за аператарам. Аператар, зыходзячы з неабходнасці, прыцягвае перавозчыкаў і, у сваю чаргу, заключае дагавор з імі.

«Такім чынам, мы будзем мець празрыстую і зразумелую сістэму гарадскіх перавозак электрычным транспартам на дагаворных адносінах», — рэзюмаваў дэпутат.

## Абавязковая хуткасць

Асноўнае новаўвядзенне законапраекта аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у закон аб электрасувязі — патрабаванне да якасці прадастаўлення паслуг. Гэта значыць, што, калі, напрыклад, інтэрнэт-правайдар дэкларуе пэўную хуткасць перадачы даных, то ён павінен яе вытрымаць у абавязковым парадку. На ўзроўні закона ўводзіцца адказнасць за адпаведнасць гэтых даных.

«Гэты закон таксама накіраваны на стварэнне канкурэнтных умоў у гэтай сферы дзейнасці, — сказаў Дзмітрый Харытончык, — для чаго прапісваюцца паўнамоцтвы органа дзяржаўнага кіравання ў гэтай сферы — аператыўна-аналітычнага цэнтра пры Прэзідэнце, які будзе вызначаць аператараў з магчымасцю пропуску міжнароднага інтэрнэт-трафіку і падключэння да замежных інтэрнэт-сетак. Гэта значыць, з моманту прыняцця гэтага закона «Белтэлеком» пазбаўляецца манапольнага права на прадастаўленне такіх паслуг. Гэта дазволіць знізіць кошт на інтэрнэт-трафік для насельніцтва».

Паняцце «нацыянальны аператар электрасувязі» замяняецца на «прызначанага аператара ўніверсальнага абслугоўвання». Прызначацца такі аператар, у залежнасці ад якасці паслуг і ўмоў, будзе Міністэрствам сувязі.

Уводзіцца паняцце «адзінай сеткі перадачы даных», права доступу да якой таксама будзе вызначаць Міністэрства сувязі.

Законапраект таксама канкрэтызуе пытанні па прадстаўленні радыёчастот, усталёўвае правілы карыстання імі. Лібералізуецца выкарыстанне радыёэлектронных сродкаў, высокачастотных устройстваў, якія не падлягаюць ліцэнзаванню.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

■ Ну і ню!

## Паўаголеная дзяўчына з інтэрнэту ў міліцыі не працуе

**У сацыяльнай сетцы дзяўчына па імені Ілона выклала свае фатаграфіі ў паўаголеным выглядзе. Усё, як той казаў, было б яшчэ нічога (наколькі так увогуле можна сказаць: такімі фотасесіямі зараз грашаць многія дзяўчаты, выстаўляючы здымкі на ўсеагульны агляд), каб яна не прадстаўлялася як «інспектар па справах непаўналетніх Ленінскага РАУС г. Мінска». Фатаграфіі пайшлі «гуляць» па інтэрнэце, збіраючы каментарыі...**

ГУУС Мінгарвыканкама аператыўна правяло папярэднюю праверку, па выніках якой паведаміла, што дзяўчына Ілона, пра якую гаворыцца ў публікацыях, без падстаў на тое ўказала на сваёй асабістай старонцы ў сацыяльнай сетцы месцам працы вышэйназванае РУУС. «Яна сапраўды звярталася з заявай у органы ўнутраных спраў з мэтай працаўладкавання. Аднак не прайшла ўстаноўленай для такіх выпадкаў праверкі і два тыдні таму ёй было адмоўлена ў прыёме на службу па негатыўных падставах. Такім чынам, яе статус на асабістай старонцы не мае нічога агульнага з рэчаіснасцю. Зараз ён выдалены. Праводзіцца далейшы разбор». Напрыканцы ў ГУУС Мінгарвыканкама нагадалі пра артыкул 24 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб сродках масавай інфармацыі», якія абавязвае журналіста правяраць дакладнасць атрыманых ім звестак і прадастаўляць для распаўсюджвання дакладную інфармацыю. «Аднак у гэтым выпадку гэта патрабаванне выканана не было».

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■

# ЖАНЧЫНЫ РУЛЯЦЬ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Марыя Сапега з вёскі Ясная Раніца Круглянскага раёна працавала выхавацелькай, але на прапанову раённага аддзела адукацыі змяніць працу пагадзілася.

— Я разумею, што адказнасць вялікая, — кажа жанчына. — Але ў мяне ў сям'і шмат дзяцей выхоўвалася, і я кірую легкавым аўтамабілем. Так што буду вучыцца, і спраўлюся. Трэба быць вельмі ўважлівым на дарозе, калі вязеш дзяцей. Не адцягваць сваю ўвагу ад дарогі і правільна прайсці маршрут. І, безумоўна, вельмі добра, што будзе новы аўтобус: гэта радасць і для мяне, і для дзяцей.

Сёлета ў школах Магілёўскай вобласці з'явяцца 32 новыя аўтобусы. 22 з іх набыты паводле дзяржаўнай праграмы ўстойлівага развіцця вёскі. Яшчэ дзесяць сельскіх раёнаў, якія больш за іншых маюць патрэбу ў тэхніцы, атрымаюць новыя аўтобусы ад Беларускага банка развіцця і рэканструкцыі, якія закупляюцца паводле распараджэння Прэзідэнта. Прычым вырашана, што дзеля бяспекі перавозкі дзяцей за руль гэтых новых аўтобусаў павінны сесці менавіта жанчыны. Для іх у Магілёве арганізавалі навучальны працэс.

— Вадзіцелі аўтобусаў з дзяўчат атрымліваюцца добрыя, таму што яны больш адказныя, — падтрымлівае ідэю выкладчык аўташколы Іван Варанко. — Можа, у іх і не атрымаецца дасканала ведаць механізмы, але правілы яны вучаць добра і строга прытрымліваюцца іх. Яны спачатку думаюць, а потым выконваюць, як і належыць.

На палігоне аўташколы пачынаецца пробны занятак па ваджэнні аўтобуса. Вопытны інструктар Сяргей Шляхтаў запрашае адну з жанчын сесці за руль. Першай «кідаецца на амбразуру» Наталля Сычова. Яна — жыхарка Быхава, працуе намеснікам дырэктара па вучэбнай рабоце ў сельскай школе, за некалькі дзясяткаў кіламетраў ад райцэнтра.

— Кожны дзень я езджу на працу на сваім аўтамабілі, і ўжо столькі тысяч кіламетраў за рулём накруціла! — усміхаецца Наталля. — Таму і вырашыла паспрабаваць стаць вадзіцелем аўтобуса, па сумяшчальніцтве. План такі: раніцай саджуся ў Быхаве ў школьны аўтобус, збіраю дзяцей па дарозе, вязу іх у Абідавічы, выходжу і станаўлюся завучам. Пасля заканчэння заняткаў — зваротны працэс. Ну чаму не?

Разам з Наталляй прыехаў на заняткі яе 7-гадовы сын Арцём. Ён з цікавасцю і гордасцю назірае за манеўрамі аўтобуса, дзе за рулём маці, і спадзяецца быць яе галоўным пасажырам.




**За руль новых школьных аўтобусаў сядуць жанчыны, якія цяпер вучацца ў тэхнічнай школе.**

Ганна Бекмансурава жыве ў вёсцы Заполле Бялыніцкага раёна: у свае 28 гадоў яна з упэўненасцю гатова памяняць працу памочніцы выхавальніцы на вадзіцеля школьнага аўтобуса. Хаця б з-за заробку: на новым месцы абяцаюць як мінімум на мільён рублёў больш.

— Мне падабаецца аўтобус, — дзеліцца яна ўражаннямі ад першай паездкі. — Вялікія габарыты — гэта не страшна, а цікава. Я думаю, нездарма я сюды прыйшла. І мяне падтрымалі сваякі і сябры: маўляў, малайчына, трэба быць смелай і рашучай!

Надзея Ніканава аддае перавагу высокім абцасам, але дзеля новай працы гатова і босымі нагамі націскаць на педалі.

— Я працавала садаводам, цяпер у дэкрэтным водпуску. Але мне спадабалася ідэя стаць вадзіцелем аўтобуса, — прызнаецца жанчына. — Цікавая прафесія, хачу паспрабаваць сябе ў новай ролі. Гэта ж незвычайна — быць заўсёды ў руху!

Алена Чакулаева прыехала з Крычава. Яна раней працавала на мясцовым маслазаводзе, потым паштальёнам, сацыяльным работнікам, а цяпер, у 43 гады, вырашыла зноў памяняць працоўную сферу і нарэшце сесці за руль аўтобуса. Яна смяецца, што жанчыны ў іх кампаніі спрабавалі вадзіць усё —ад трактароў і да грузавікоў, таму павінны справіцца з чарговай, амаль што мужчынскай прафесіяй.

— Лёгкіх заняткаў сёння ўвогуле няма, — мяркуюць жанчыны. — Усюды адказнасць. А мы можам і да космасу дабрацца, калі трэба.

Не сакрэт, што ў наш час жанчыны амаль што пагалоўна селі за руль легкавікоў, многія прадпрымальніцы з лёгкасцю кіруюць мікрааўтобусамі. А цяпер прыгажуні і разумніцы з энтузіязмам асвойваюць і прафесію вадзіцеля аўтобуса.

— Жанчыны за рулём — гэта вельмі добра, — не маюць сумненняў Наталля Сычова і яе калегі. — Мы ўважлівыя, адказныя і спакойна ставімся да, прабачце, усіх дурняў на дарозе. Думаю, мы павінны справіцца з задачай.

Акрамя таго, што жанчыны будуць вельмі акуратна вадзіць школьныя аўтобусы і вельмі абачліва паводзіць сябе на дарозе, ёсць яшчэ і іншая нагода для таго, каб за руль новых аўтобусаў селі менавіта прадстаўніцы прыгожай паловы чалавецтва. Ім у правінцыі цяжэй знайсці працу з добрым заробкам, а таму вакантныя месцы вадзіцеляў будуць на карысць жаночай занятасці.

У некалькіх сельскіх раёнах адразу знайшлі ахвотніц заняць новыя працоўныя месцы. Гэта ў асноўным жанчыны, якія ўжо займаліся пасажырскімі перавозкамі на маршрутных таксі.

У Клімавіцкім раёне жанчына, якая возьмецца за падвоз дзяцей у сельскай мясцовасці ва ўстановы адукацыі, цяпер працуе ў сферы гандлю, але яна — не навічок у транспартным руху і кіравала маршруткай больш за тры гады. У раённым аддзеле адукацыі спадзяюцца, што новы школьны аўтобус будзе ў добрых руках.

У аддзеле адукацыі Асіповіцкага райвыканкама расказалі, што ім пашанцавала: яны знайшлі на месца вадзіцеля новага аўтобуса жанчыну, якая больш за дзясятак гадоў адпрацавала на маршрутным таксі. Яна сярэдняга ўзросту, мае сям'ю і двух дзяцей, жыве ў пасёлку паблізу ад раённага цэнтра. І, што вельмі важна для ўсіх, яна сама рада заняцца перавозам дзяцей. Заробак папярэдне акрэсліваецца ў 3 мільёны рублёў.

— Новыя аўтобусы — гэта вельмі важна, — паведаміла начальнік аддзела тэхнічнага нагляду і развіцця матэрыяльна-тэхнічнай базы навучальных устаноў упраўлення адукацыі Магілёўскага аблвыканкама Ганна Блюмнік. — Школьныя аўтобусы павінны мяняцца пасля 10 гадоў эксплуатацыі, і мы робім паэтапную замену. Таксама працягваецца рэарганізацыя ўстаноў адукацыі, і таму значэнне падвозу дзяцей ў школы і дзіцячыя садкі ў сельскай мясцовасці павялічваецца.

Сёлета ў Магілёўскай вобласці скароціцца колькасць устаноў адукацыі — іх стане менш на 23, а яшчэ 12 будуць рэарганізаваныя. Ва ўпраўленні адукацыі тлумачаць, што ў некаторых класах сельскіх школ вучацца па адным ці два дзіцяці: гэта не толькі негатыўна ўплывае на якасць навучальнага працэсу з-за адсутнасці здаровай канкурэнцыі, але і эканамічна нявыгадна. Таму робіцца аптымізацыя ўстаноў адукацыі. І ў такіх умовах, калі ўсё больш дзяцей будзе вучыцца ў суседніх вёсках, аграгарадках альбо райцэнтрах, усё больш націск робіцца на школьны транспарт і, безумоўна, на бяспеку перавозкі дзяцей.

**Ілона ІВАНОВА. Фота аўтара.**

■ Трагедыі

## Патануў, ратуючы ўнучку

**У Пінскім раёне мужчына загінуў, ратуючы з вады сваю ўнучку.**

50-гадовы пінчанін адпачываў з роднымі на беразе Прыпяці. У нейкі момант мужчына заўважыў, што яго малыя ўнук і ўнучка тонуць у рацэ. Яго прыяцель выцягнуў з вады хлопчыка, а сам дзядуля кінуўся ратаваць унучку. Дзяўчынка засталася жывой. А самому пінчаніну выплысць не ўдалося. Паводле інфармацыі таварыства выратавання на водах на вадаёмах Брэсцкай вобласці за мінулы тыдзень загінулі тры чалавекі.

**Яна СВЕТАВА.**

## У Канадзе пітон задушыў хлопчыкаў

**Паліцыя Канады расследуе абставіны гібелі двух хлопчыкаў, якіх задушыў пітон, што ўцёк з экзатычнага магазіна.**

Хлопчыкі ва ўзросце пяці і сямі гадоў спалі ў сваёй кватэры, размешчанай над зоамагазінам у горадзе Кэмпбелтан, у правінцыі Нью-Брансуік. Прадстаўнік Каралеўскай канадскай коннай паліцыі заявіў, што змяя запаўзла ў кватэру па сістэме вентыляцыі. Дзяцей знайшлі мёртвымі ў панядзелак, 5 жніўня, раніцай. Паводле папярэдніх звестак, пітон задушыў іх. Змяю ўжо злавілі.

■

# ПА РАКАЎ НА БЕЛАЕ ВОЗЕРА...





Каманда пераможцаў па лоўлі ракаў.

**Карэспандэнт «Звязды» пабываў на спаборніцтвах па спартыўнай лоўлі ракаў, якія адбыліся ў мінулую суботу ў Полацкім раёне.**

«Алімпіяда» ракаловаў адбылася на возеры Белае — адным з больш за 300 на тэрыторыі Полацкага раёна. Возера Белае можна назваць жамчужынай Полацкага раёна. Людзі з вялікім задавальненнем прыязджаюць адпачыць на яго бераг. Сапраўдны цуд: праз шмат гадоў тут цяпер можна лавіць ракаў, якіх доўгі час не было. А вядома, што ракі любяць чыстую ваду.

Летась аўтар гэтых радкоў таксама браў удзел у лоўлі ракаў, а сёлета вырашыў паназіраць за захапляльным працэсам збоку.

Праходзіў чэмпіянат па спартыўнай лоўлі ракаў у другі раз — у рамках раённага турыстычнага злёту. Усе ахвотныя маглі прыняць удзел у спаборніцтвах. За 3 хвіліны трэба было злавіць як мага больш ракаў, не выкарыстоўваючы пакетаў, голымі рукамі. Пасля спаборніцтваў, у якіх удзельнічалі прадстаўнікі 7 каманд, стала вядома, што ў возера запусцілі каля 300 ракаў.

Памятаю на асабістым вопыце, што не проста на дне знайсці рака, які «зліваецца» з камянямі, закопваецца ў пясок. А калі імгненна яго не зловіш — можа «збегчы».

У выніку здабыча ўдзельнікаў (21 чалавек) была даволі вялікай — 41 рак. Па традыцыі, злоўленых ракаў пасля падліку кінулі ў ваду.

Перамаглі ў чэмпіянаце прадстаўнікі ўнітарнага прадпрыемства «Полацкводаканал» (11 ракаў). Для параўнання, па выніках леташніх спаборніцтваў у камандным заліку выйграла каманда Полацкага філіяла «Вяснаэнерга» РУП «Віцебскэнерга» (17 ракаў).

Як і летась, перад пачаткам спаборніцтваў у ваду запускалі ракаў прадстаўнікі полацкага рэспубліканскага прадпрыемства меліярацыйных сістэм, дзе займаюцца зарыбленнем вадаёмаў.



Прэзентацыя страў.

Высветлілася, што пакуль пра вялікія дасягненні ў прамысловым развядзенні рака, на жаль, гаварыць рана. Паводле слоў маіх суразмоўцаў, у крамы жывы рак пакуль не пастаўляецца. Зразумела, што па цане айчынны рак быў бы ў разы таннейшы за іншаземнага «брата». Напрыклад, летась апошні прадаваўся па цане 160 тысяч рублёў за кіло. Расціць ракаў — сяголеткаў да прамысловага памеру (9 сантыметраў, — **Аўт.**) трэба 4-5 гадоў. Так што пачакаем.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
**Фота аўтара.**


Ад імя праўлення
і прафкама СВК «Плешчыцы» Пінскага раёна

Разам з намі!

Ад шчырага сэрца віншуем старшыню нашага СВК, у мінулым калгаса імя Горкага, **Валерыя Сяргеевіча ДАВЫДЗЕНКУ з 60-годдзем**. Нам прыемна, што за апошняе 10-годдзе вёска Плешчыцы не толькі змяніла сваё аблічча, але і стала цэнтрам сучаснага сельгаспрадпрыемства. У тыя радасныя перамены, якія адбыліся, важкую часцінку сэрца, свайго розуму і арганізатарскіх здольнасцяў уклалі і Вы, шаноўны Валерый Сяргеевіч, разам з працалюбівымі вяскоўцамі. Усе мы вельмі ўдзячны Вам за гэта. А таму жадаем душэўнага спакою за зробленае, трывалага здароўя і дабрабыту ў сям'і, незабыўнага святкавання юбілею і шчодрага, як тутэйшая ўраджайная ніва, даўгалецця разам з намі.



Старшыні СВК «Плешчыцы»
**Валерыю Сяргеевічу ДАВЫДЗЕНКУ**

Шаноўны Валерый Сяргеевіч!

Вы нарадзіліся ў жніво. І ў гэтую ж цудоўную пару года адзначаеце свой 60-гадовы юбілей. Віншуем! Зычым Вам усяго найлепшага ў жыцці — светлага свята ў гэтыя летнія дні, самых найлепшых пажаданняў ад дарагіх для Вас людзей ды кветак пабольш, як зерня ў засеках. І ў будучыні заставайцеся шчырым працалюбам, сумленным і патрабавальным кіраўніком, мудрым вяскоўцам, да якога хіляцца людзі. Гадоў да ста расці Вам без старасці!



**З павагай, Сяргей Мікалаевіч Сазанчук,**
**старшыня СВК «Ласіцк»**
**Пінскага раёна.**

**Шаноўны Валерый Сяргеевіч!**

Сёння ў Вас юбілей! А таму ад імя нашых вяскоўцаў і вашых суседзяў ад шчырага сэрца віншую з 60-годдзем. Дзесяць гадоў жыцця аддалі Вы гаспадарцы, у якой пад Вашым кіраўніцтвам прыгожыя душой і рукамі людзі шмат зрабілі для развіцця і росквіту ранейшага палескага калгаса. Жадаем Вам і надалей светлага зямнога шчасця, дабрабыту і спакою ў сям'і, моцы духу і здароўя, сонечных дзён да наступных юбілеяў.

**З павагай,**
**Сяргей Уладзіміравіч Крыльчук,**
**старшыня праўлення**
**СВК «Лапаціна» Пінскага раёна.**



**Шаноўны Валерый Сяргеевіч!**

Сёння ў Вас юбілей! Ажно шэсць дзясяткаў гарачых жніўняў за шырокімі плячыма. Віншуем! І шчыра жадаем: няхай іх будзе ўдвая больш. За гэта наш святочны тост! Працуйце заўзята — жывіце багата!



**З павагай,**
**Аляксандр Лявонцьевіч Андрыевіч,**
**старшыня СВК «Валішча»,**
**кіраўнік Пінскага райаграпрамсаюза.**


## У Камітэце дзяржкантролю

# «ЗАЛАТЫЯ» ДРОВЫ

**Па выніках праверкі Камітэта дзяржкантролю Віцебскай вобласці ўнітарнага прадпрыемства «Коханава-ЖКГ» вярнулі ў казну больш за 900 мільёнаў рублёў незаконна атрыманых бюджэтных грошай.**

— Падчас праверкі было ўстаноўлена, што створаны УП ЖКГ «Коханава-ЖКГ» участак па лесанарыхтоўцы, распілоўцы і апрацоўцы драўніны забяспечвае кацельні прадпрыемства дровамі, сабекошт якіх у разы перавышае цэны пастаўкі дроў Талачынскім лясгасам. Пры планаванні і выдзяленні бюджэтных субсідый на пакрыццё часткі затрат па паслугах, аказаных насельніцтву, параўнальны аналіз цэн на дровы не ажыццяўляецца, а нарыхтоўка дроў аплачваецца з бюджэту. Згодна з разлікамі, высокі сабекошт нарыхтоўкі дроў пацягнуў за сабой павелічэнне выдаткаў на цеплазабеспячэнні ў 2011—2013 гадах на 2,5 мільярда рублёў, — паведамілі ў камітэце.

Акрамя таго, высветлілася, што нарыхтаваныя ўласнымі сіламі дровы маюць павышаную вільготнасць. Зразумела, гэта прыводзіць да іх звышнарматыўнага расходавання. У выніку па прадпрыемстве сабекошт такой энергіі перавышае сабекошт энергіі, выраблёнай з прыроднага газу.

Па выдатках у часткі паслуг водазабеспячэння сітуацыя аналагічная. На прадпрыемстве ў цэлым фактычныя страты і не ўлічаныя выдаткі вады ў сетках складалі да 30% ад аб'ёму (пры нарматыве 19,6%). Па асобных свідравінах страты дасягалі 92%. У выніку допушчаныя парушэнні пацягнулі завышэнне сабекошту жыллёва-камунальных паслуг, неданалічэнне падаткаў і незаконнае атрыманне прадпрыемствам у 2011-2012 гадах бюджэтных сродкаў на суму 904,3 мільёна рублёў.

Па выніках праверкі, незаконна атрыманыя бюджэтныя сродкі вернуты ў бюджэт. На прадпрыемства накладзены штрафы на агульную суму 934,3 мільёна рублёў. Да адміністрацыйнай адказнасці прыцягнулі 5 службовых асоб, да дысцыплінарнай — 15.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## ЧАТЫРЫ ГАДЫ АЛІВАК НЕ БАЧЫЦЬ...

**У сталічнай краме «Мясны рад», размешчанай па вуліцы Талбухіна, удзень спрацавала «трывожная кнопка»...**

Высветлілася, што малады чалавек адкрыта скраў дзве бляшанкі алівак і ўцёк. Нарад групы затрымання Першамайскага аддзела дэпартамента аховы г. Мінска на прылеглай тэрыторыі «сустрэў» раней не судзімага, не працуючага жыхара сталіцы. Падазронага даставілі для разбору ў Першамайскі РУУС. Маладому чалавеку пагражае пазбаўленне волі да чатырох гадоў.

**Сяргей СТАРЫНАЎ.**

## Інфарм-укол

# НЕБЯСКРЫЎДНАЯ «СВІНКА»

**Ліхаманка, агульнае дрэннае самаадчуванне, боль у мышцах, галаўны боль, парушэнне сну і апетыту, павелічэнне слінных залоз, сухасць у роце, болі ў вуху, якія ўзмацняюцца падчас жавання і маўлення, могуць указваць на эпідэмічны паратыт, або «свінку». Небяспечнае гэта захворванне архітам (запаленне яечка), радзей — панкрэатытам, менінгітам, глухатой, артрытам і інш. У будучым у мужчын можа развіцца атрафія яечка і бясплоднасць, а ў жанчын — атрафія яечнікаў, бясплоднасць, парушэнне менструальнай функцыі, нагадвае загадчыца аддзялення імунапрафілактыкі Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Вераніка ШЫМАНОВІЧ.**

Эпідпаратыт перадаецца пры кашлі, чханні, размове або праз забруджаныя вірусам рэчы — напрыклад, посуд, цацкі. Шпіталізацыя хворых адбываецца, калі дзіцяці менш за 1 год, калі эпідпаратыт — у цяжкай форме, пры наяўнасці ўскладненняў, калі дзіця знаходзіцца ва ўстанове з кругласутачным рэжымам знаходжання, пры наяўнасці ў сям'і дзяцей або цяжарных, якія не атрымалі поўны курс прафілактычных прышчэпак супраць свінкі.

Самы эфектыўны сродак прафілактыкі — вакцынацыя. Выкарыстоўваецца камбінаваная вакцына супраць адру, эпідпаратыту і краснухі. Дзякуючы прышчэпкам удаецца не дапускаць успышак захваральнасці ў дзіцячых калектывах. Вакцынацыя праводзіцца дзецям ва ўзросце 1 год і 6 гадоў. Проціпаказаннямі да ўвядзення вакцыны з'яўляюцца алергічная рэакцыя на папярэднюю прышчэпку, імунадэфіцыт, цяжарнасць. Пры вострым захворванні прышчэпка адкладваецца да выздараўлення.

# КАЛІ КРАСНУХА — У ЦЯЖАРНАЙ

**Краснуха ў жанчын падчас цяжарнасці часта становіцца прычынай цяжкіх прыроджаных парокаў развіцця дзяцей. Як правіла, парокі ў дзяцей узнікаюць пры захворванні ў першыя тры месяцы цяжарнасці, кажа медсястра 23-й гарадской дзіцячай паліклінікі г. Мінска Ірына ШАЎЦОВА.**

Захворванне жанчыны ў першыя 3 месяцы цяжарнасці — паказанне да перарывання цяжарнасці. Прыроджаная краснуха праяўляецца ў немаўляці парокам сэрца, катарактай, глухатой, паражэннем цэнтральнай нервовай сістэмы, парокамі развіцця стрававальнай і мочавыдзяляльнай сістэм. Пры заражэнні краснухай жанчын у больш позні тэрмін цяжарнасці вірусная паражэнне плода пры нараджэнні звязана з малакроўем, хваробамі ўнутраных органаў.

З дапамогай спецыяльных аналізаў можна ўстанавіць, ці ўспрымальны чалавек да краснухі, ці хварэе ён на яе, паколькі ў дарослых інфекцыя працякае нестандартна.

Заявіць пра сябе вірус краснухі можа насмаркам і кашлем, прыпуханнем і хваравітасцю лімфавузлоў на патыліцы і шыі, бледна-ружовым сыпам на твары і целе, часам высокай тэмпературай. Ускладненні пры краснусе рэдкія: артрыты, часцей у дарослых, краснушныя энцэфаліты.

У каляндар прышчэпак уведзена вакцынацыя супраць адру, эпідпаратыту і краснухі ва ўзросце 1 год і 6 гадоў. У Мінску зацверджаны пашыраны каляндар прафілактычных прышчэпак, дзе прадугледжана вакцынацыя супраць краснухі дзяўчынак у 15 гадоў. Гэта дазволіць пазбегнуць небяспекі прыроджанай краснухі.

**Святлана БАРЫСЕНКА**

# АХОВА
## ПАД ЗНАКАМ САВЫ
№ 4 (37)

СУМЕСНЫ ВЫПУСК «ЗВЯЗДЫ» І ДЭПАРТАМЕНТА АХОВЫ МУС РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ


**КОНКУРС ПРАЦЯГВАЕЦЦА**

*Нагадваем, што Дэпартамент аховы сумесна з рэдакцыяй нашай газеты праводзіць творчы конкурс на лепшую публікацыю аб дзейнасці службы аховы.*

*Для ўдзелу ў конкурсе запрашаюцца як рэдакцыі сродкаў масавай інфармацыі, так і самі журналісты і пазаштатныя аўтары.*

*Пераможцы будуць вызначаны ў наступных намінацыях:*

*1) «Лепшая публікацыі ў перыядычным друку»;*

*2) «Лепшая публікацыя ў інтэрнэт-СМІ»;*

*3) «Лепшая фотаработа».*

*Больш падрабязна аб умовах конкурсу можна даведацца на сайце Дэпартамента аховы ohrana.gov.by ў раздзеле «Творчы конкурс» і на сайце газеты «Звязда».*

# ІХ СЛУЖБА НЕ ВЕДАЕ СПАКОЮ,

## або Адны суткі побач з дзяжурнай зменай пункта цэнтралізаванага назірання

**Сярод асабовага складу падраздзяленняў Дэпартамента аховы ёсць асаблівы калектыў — своеасаблівае «сэрца» сістэмы аховы, дзякуючы якому каардынуецца праца нарадаў і груп затрыманняў. Ад аператыўнасці і ўважлівасці якіх таксама ў немалой ступені залежыць бяспека аб'ектаў, захаванасць маёмасці грамадзян, а часам — і чалавечае жыццё...**

Дзяжурныя пункта цэнтралізаванага назірання — гэта прадстаўніцы слабага полу. Аднак задачы, пастаўленыя перад імі, здольны выканаць не кожны мужчына. І паслабленняў ім тут ніхто не робіць.

Каб зразумець, як яны служаць, трэба паспрабаваць. Мы накіраваліся ў Партызанскі аддзел Дэпартамента аховы сталіцы, дзяжурныя якога ўжо не адзін год перамагаюць у конкурсе на лепшы ПЦН.

Працоўны графік супрацоўніц тут пазменны: дзень—ноч па 12 гадзін. У Партызанскім аддзеле працуюць чатыры змены па пяць чалавек, а ў некаторых раёнах дзяжурных яшчэ больш. Пачаць разумець азы гэтай прафесіі мне пашчасціла з 8 раніцы: у гэты час — перазменка.

Старшая дзяжурнай змены, якая заступае, Мая Аксяневіч пагадзілася расказаць пра сваю працу, аднак папярэдзіла, што асабліва адхіляцца не мае права — падрабязнасці, якія цікавіць, трэба будзе спасцігаць самой.

— Зараз мы правяраем кропкі трывожнай сігналізацыі на аб'ектах. Запісваем у рабочы сшытак час зняцця. У нас каля двухсот кнопак (аб'ектаў, дзе ажыццяўляецца ахова грамадскага парадку з дапамогай ручных сістэм трывожнай сігналізацыі), і да 11 раніцы ўсе іх трэба праверыць. Пасля электраманцёры пачынаюць выконваць планавыя і пазапланавыя рэгламентныя работы.

Наша гутарка літаральна кожныя 30 секунд перарываецца тэлефоннымі званкамі, і Мая Пятроўна бадзёра адказвае: «Добрай раніцы! Пульт 14-ты. Слухаю вас...». У памяшканні знаходзяцца яшчэ тры яе памочніцы: Святлана Прымакова, Святлана Гурыновіч і Наталля Жалевіч. З кожнага камп'ютара прыходзяць розныя сігналы. У кагосьці аб'ект здымаецца з аховы, у некага выдае няспраўнасць. Часам раздаецца сігнал «Трывога». Я тут усяго дзесяць хвілін, а ў галаве ўжо стаіць неймаверны гул. Гледзячы на мяне, жанчыны ўсміхаюцца: «Не перажывай, з намі было тое ж самае, калі дваццаць з лішнім гадоў таму ўпершыню пераступілі парог гэтага аддзела... Уся наша маладосць прайшла тут, дзеткі выраслі на нашых вачах. Вось Наташкіны яшчэ падрастаюць (Наталля самая маладая з прысутных, стаж яе працы ў гэтым калектыве крыху больш за дзесяць гадоў). Мы ўжо нібы адна сям'я, і, калі нешта не ладзіцца, ведаем: дзяўчаты абавязкова падтрымаюць і дапамогуць».

Час каля дзесяці, зноў пагружаемся ў працу. «Самае складанае — увесь час канцэнтраваць увагу на маніторы і быць вельмі сабранай, — падкрэслівае Мая Пятроўна. — Самае малое адцягванне ўвагі можа прывесці да непапраўных наступстваў».

На маніторы высвечваецца сігнал «Трывога». З дапамогай радыёстанцыі дзяжурная перадае бліжэйшаму экіпажу адрас і прычыну: аб'ект зняўся невядомым ключом, а гэта фактычна несанкцыянаванае пранікненне. Інфармацыя перадаецца і дзяжурнаму афіцэру аддзела, які каардынуе далейшыя дзеянні міліцыянераў.



З дапамогай аднаго камп'ютара дзяжурная можа сачыць за станам звыш 1200 аб'ектаў. Пры зняцці з аховы яна бачыць, якім ключом адключаецца сігналізацыя. Нават самыя вопытныя кліенты часам няправільна ставяць кватэру пад ахову ці здымаюць з яе. Паколькі сваіх дзяжурных яны ведаюць не адзін год, такая замінка вырашаецца хутка.

— Людзі сустракаюцца розныя, — расказваюць жанчыны. — За столькі гадоў мы часта нават па голасе пазнаём таго, хто тэлефануе. Як і ў любой працы з людзьмі, без казусаў не абыходзіцца. Часцей за ўсё капрызнічаюць пажылыя людзі і так званыя «зоркі». Апошніх вельмі абурае, што іх не пазнаюць або чаму не з першага званка бяруць трубку, калі такая знакамітасць на правадзе...

Пры заключэнні дагавора на ахову кліент дае падрабязную інфармацыю пра сябе і блізкіх, каб у выпадку небяспекі міліцыянеры маглі дзейнічаць па абставінах, ведаючы ўсе, так бы мовіць, магчымыя падводныя камяні. Фіксуецца нават наяўнасць хатніх гадаванцаў. Непрыемна, калі дзяжурны выедзе для агляду памяшкання, а ў кватэры яго чакае злы сабака... Адна кватэра пастаянна «спрацоўвала» некалькі дзён запар. Для агляду выязджаў нарад, накіроўвалі электраманцёра для пошуку непаладак. Вычарпалі ўсе варыянты, пакуль уладальнікі не вярнуліся з водпуску і не прызналіся, што парушальнікам спакою аказаўся хатні кажан, пра якога яны забылі папярэдзіць.

Час набліжаецца да 11.00, электраманцёры паціху пачынаюць адпачываць з ахоўных аб'ектаў, правяраць працаздольнасць сігналізацыі. Усе іх паведамленні фіксуюцца ў рабочых сшытках дзяжурных.

Для праверкі тых самых сшыткаў прыходзіць намеснік начальніка Партызанскага аддзела — начальнік аддзела сродкаў і сістэм аховы, падпалкоўнік міліцыі Максім Копач. Максім Іванавіч расказвае супрацоўніцам пра аператыўнае становішча. Пасля абавязкова спытае, як справы, настрой, што новага. Прычым не забудзе сказаць пару кампліментаў: дзяжурныя ж — перш за ўсё жанчыны!

Бліжэй да поўдня становіцца спакайней. Званкоў ужо значна менш, электраманцёры папярэджваюць пра выкананыя работы на аб'ектах. Радыёстанцыя інфармуе пра тое, што адбываецца ў раёне. Адно з паведамленняў выклікае ва ўсіх буру эмоцый: на адной са сталічных вуліц знойдзена каляска з аднагадовым дзіцем, у выпадку з'яўлення бацькоў неабходна звярнуцца ў мясцовы РАУС.

— І гэта не адзіны выпадак, калі бацькі пакідаюць дзяцей. Мы ўсе мамы, а некаторыя ўжо і бабулі, — тым складаней зразумець, як такое наогул магло адбыцца. Вось так сядзім і перажываем да канца змены, пакуль не пачуем паведамленне, што бацькі аб'явіліся.

Вячэрняя змена пачынаецца не менш інтэнсіўна, чым ранішняя. Цяпер аб'екты здаюцца пад ахову. На гукі і мірганне ў маніторах я ўжо рэагую спакайней. Сутнасць прафесіі нібы ўлоўлена, аднак садзіцца за камп'ютар для працы яшчэ рана. Звычайна навічкам патрабуецца на гэта не менш за два тыдні.

У вячэрні час часцей за ўсё прыходзяць сігналы аб «аварыях» на кватэрах. Прычын тут некалькі. Людзі лянуюцца мяняць акумулятарныя батарэі ў ахоўным прыборы. Рэзервовае сілкаванне не спраўляецца, сістэма спрацоўвае і група затрымання абавязана выехаць туды. Калі гаспадара няма, то нарад застаецца ахоўваць жыллё да прыбыцця ўладальнікаў.

Яшчэ адной новай праблемай з'яўляецца няправільнае падключэнне інтэрнэту. Грамадзяне лянуюцца набыць спліттар, які б раздзяляў тэлефонныя лініі. Абанент спакойна сядзіць у інтэрнэце, а дзяжурная пункта цэнтралізаванага назірання атрымлівае сігнал «аварыі» ў яго кватэры.

Бліжэй да поўначы здача аб'ектаў пад ахову завяршаецца. Кожная дзяжурная па журнале праводзіць зверку: ці ўсе пазванілі? Паўночнікаў, якія прыпазніліся, супрацоўніцы набіраюць самі.

Раптоўна на пульце «спрацавала» кватэра: зняцце з аховы ажыццяўлялася невядомым ключом. Бліжэйшы нарад тут жа выязджае на месца. Міліцыянеры высвятляюць, што гаспадыня кватэры дала ключы знаёмай, а тая няправільна скарысталася электронным ключом. Інфармацыя пра яе ў журнале адсутнічае, таму пакуль сама гаспадыня не патэлефануе ў аддзел, назваўшы неабходны пароль, грамадзянку ў кватэру не ўпусцяць.

Начная змена тым і цяжкая, што хоць працы крыху менш, аднак уважлівасць патрабуецца большая. За акном якраз збіраецца навальніца, тут ведаюць пра яе небяспечныя наступствы: можа выйсці са строю абсталяванне, кватэры пачнуць "спрацоўваць" і ночка перастане быць спакойнай. Падымаецца ўвесь асабовы склад аддзела. Калі не хапае экіпажаў і супрацоўнікаў, каб ахапіць тэрыторыю масавых спрацовак, на дапамогу падключацца бліжэйшыя нарады суседніх падраздзяленняў.

Далёка за поўнач, а жанчыны ні хвіліны не сядзяць без справы: калі няма званкоў і экран манітора не страціць яркімі таблічкамі, яны запаўняюць рабочыя сшыткі, куды заносяць па хвілінах інфармацыю пра аб'екты, якія спрацавалі, і няспраўнасці, якія ўзніклі, каб раніцай электраманцёры аператыўна выправілі непаладкі.

Іх служба спакою не ведае. І перапынкаў таксама.

# На ахову заступае чэмпіён свету

**На чэмпіянаце свету па гіравым спорце старшына міліцыі Кастрычніцкага аддзела аховы з Гродна Андрэй Крупнякоў стаў чэмпіёнам у двубор'і.**



Падобныя спаборніцтвы праводзяцца штогод і з'яўляюцца вельмі прадстаўнічымі. Сёлета за перамогу змагаліся 150 спартсменаў з 12 краін свету. Прыемна, што менавіта беларус атрымаў тут перамогу. Набраўшы ў суме 288,5 ачка, Андрэй не пакінуў ніякіх шанцаў сваім канкурэнтам.

Спартыўныя поспехі старшыны Крупнякова выпадковымі не назавеш. Андрэй здабыў ужо нямала перамог на розных унутрырэспубліканскіх і міжнародных спаборніцтвах. Тут яму няма роўных. Аднак не толькі гіры з'яўляюцца яго «каньком»: Андрэй неаднойчы станавіўся прызёрам чэмпіянату Дэпартамента аховы па рукапашным баі. У дадатак ён яшчэ і лідар каманды Гродзенскай вобласці па стральбе з табельнай зброі і службовым мнагабор'і.

А спартыўныя поспехі старшыны чаргуюцца з высокімі вынікамі службовай дзейнасці: міліцыянер-вадзіцель Андрэй Крупнякоў рэгулярна заступае на дзяжурства, прымае непасрэдны ўдзел у раскрыцці злачынстваў, учыненых у зоне адказнасці яго экіпажа, падтрымлівае ў належным стане службовы аўтатранспарт і з'яўляецца выдатным напарнікам. Саслужыўцы падмячаюць, што ёсць у Андрэя такая рыса — старацца ва ўсім і заўсёды быць першым: што ў службе, што на чэмпіянатах і першынствах. А патэнцыйныя парушальнікі павінны ведаць, што службу па ахове правапарадку ў Гродне цяпер нясе не хто іншы, а чэмпіён свету.

# ТРАЙНЯ КАПІТАНА КІСЯЛЁВА



**Капітан міліцыі Дзмітрый Кісялёў, як сапраўдны мужчына, вырашыў пераняць традыцыйную форму шчасця: пасадзіць дрэва, пабудаваць дом і вырасціць сына. З дзецьмі атрымалася як у кіно: захацеў шчасця — а яго ўтрая «прываліла»!**

— Пасля школы паступіў у Гомельскі машынабудаўнічы тэхнікум, аднак ужо на апошніх курсах зразумеў, што гэта не маё і трэба штосьці мяняць. Пайшоў у армію. Менавіта там і вырашыў, што пасля арміі пайду ў міліцыю. Выбар спыніў на ахове: я чалавек адказны і стaранны, а праца дзяжурных змен заўсёды ўражвала.

Спачатку працаваў міліцыянерам-кінолагам у Савецкім аддзеле аховы Гомеля, потым назначылі памочнікам камандзіра ўзвода. Праца падабалася, кожны дзень быў непрадказальны. Дапамога людзям, фактычна штодзённае затрыманне правапарушальнікаў стымулявала. Паступіў на завочнае аддзяленне Магілёўскага каледжа МУС.

У 2007 годзе мне прапанавалі пасаду камандзіра ўзвода ў Цэнтральным аддзеле аховы. Можна сказаць, што яшчэ адна пастаўленая мэта была рэалізавана — тады ж я атрымаў і афіцэрскае званне.

**— А як складвалася жыццё сямейнае?**

— У той час з Танюшай туліліся ў здымнай кватэрцы. Калі жонка зацяжарала, з нецярпеннем чакалі вынікаў медыцынскага абследавання. Тацяна пайшла на дыягностыку ў паліклініку, я быў у горадзе па справах. Памятаю, жонка патэлефанавала: «Віншую, татуля, у цябе будзе трайня». Шчыра прызнаюся, у мяне тады аж мову адняло...

**— Што змянілася ў жыцці са з'яўленнем трайнятак?**

— Спачатку было вельмі цяжка, толкам выспацца ніколі не ўдавалася: малыя патрабавалі клопату і ноччу. Аднак дом ёсць дом, а служба — службай. З 2010 года пайшоў на павышэнне — стаў камандзірам роты аддзела аховы. Расцілі малых, спраўляліся з усімі цяжкасцямі. Нам вельмі дапамагалі бабулі з дзядулямі. Танюшы было больш складана, чым усім, але яна ні разу не паскардзілася. Пры вырашэнні розных пытанняў, па магчымасці, дапамагалі родныя, сябры і, безумоўна, калегі. Дзяржава дапамагла вырашыць асноўную праблему з жыллём, выдзеліўшы трохпакаёвую кватэру на льготных умовах. Мясцовыя выканкамы аказваюць дагэтуль неабходную сацыяльную дапамогу. Цяпер ужо вось стала лягчэй: дзеткі нарэшце падраслі.

Кожны дзень, калі іду раніцай на працу і саджуся ў аўтамабіль, заўсёды гляджу на шосты паверх, дзе акно нашай кватэры, з якога дружна махаюць ручкамі ўсе трое маіх дзетак. Яны ўжо сёння мараць пра будучыню. Дачка кажа, што будзе спяваць і танцаваць, як «зоркі» на тэлеэкране, а Паша і Ваня, бачачы мяне ў форме, не задумваючыся адказваюць, што «будуць як тата». Убачыўшы любы міліцэйскі аўтамабіль, дзеці дружна крычаць: «Таты сябры паехалі!»

**Матэрыялы паласы падрыхтавала Алена ЯРМАЛІНСКАЯ.**

■ Любы капрыз...

# АДПРАВІЦЬ І З КАМФОРТАМ АТРЫМАЦЬ!

**Аматараў пісаць лісты, згадзіцеся, няшмат, а вось атрымлівацъ іх гатовы ўсе, хоць кожны дзень...**

Днямі паштавікі Беларусі ўкаранілі новую паслугу, якая называецца «Ліст «Камфорт». Гэта значыць, што пры жаданні заказны ліст, які паступіў на ваша імя, вам можа прывезці «Паштовы кур'ер» — у любы, зручны для вас час, у любое месца. І трэба для гэтага зусім няшмат: нумар вашага мабільнага тэлефона, які на канверце або пакеце (вага заказнога ўкладання не павінна перавышаць 2 кг) можа пазначыць адпраўшчык. А далей ужо справа тэхнікі, як той казаў: супрацоўнікі аддзялення сувязі, атрымаўшы ліст, патэлефануюць вам, спытаюць, калі і куды яго даставіць, колькі гэта будзе каштаваць... Тарыфаў, дарэчы, некалькі: «Эліт» — гэта выезд аўтамабіля ў дзень прыёму заяўкі, «Оптыма» — выезд на працягу дня (пры прыёме заяўкі да 12 гадзін) або «Эканом» (выезд цягам дня, наступнага за днём заяўкі)...

— Дастаўка тавараў або паслуг паштовымі кур'ерамі, — зазначыла **намеснік генеральнага дырэктара РУП «Белпошта» Таццяна ГВОЗДЗЕВА,** — справа вельмі зручная, а для многіх ужо і прывычная. Як паказала яе развіццё, нашы кліенты, у тым ліку і карпаратыўныя, часта сутыкаюцца з тым, што нейкія дакументы, схемы, фотаздымкі трэба атрымаць максімальна хутка... І мы, паштавікі, вядома ж, можам гэтаму паспрыяць. Таму новая паслуга «Ліст «Камфорт», упэўнена, прыжывецца і будзе запатрабаванай.

Даведкі па ёй, як і безлічы іншых, можна атрымаць па тэл. 154, на сайце прадпрыемства www.belpost.by а таксама ў любым аддзяленні паштовай сувязі ці падраздзяленні «Бізнес-пошты».

Пакуль скарыстацца паслугай можна толькі на тэрыторыі Беларусі. Вядома ж, пры жаданні: той, хто прызвычаіўся сваю карэспандэнцыю атрымліваць сам, ад прывычкі можа не адмаўляцца.

**Валянціна ДОЎНАР**

■

НА КОНКУРС АПАВЯДАННЯЎ

**Дзмітрый Пятровіч — бард, паэт, празаік. Прычым у кожным сваім творчым праяўленні ён ці не ў першую чаргу імкнецца, што называецца, сыграць на струнах чалавечай душы — слухача альбо чытача. І таму так любіць прыдумляць меладраматычныя сюжэты, у якіх героі шмат перажываюць і пакутуюць. Магчыма, за гэтым ужо бачна рука будучага сцэнарыста?**

**Алесь БАДАК.**

## Дзмітрый ПЯТРОВІЧ

# ХВОРАЕ СЭРЦА

### 1

Майскі гарачы поўдзень. Тралейбус забіты народам. Іжэвіч стаіць каля расчыненага акенца і з прагнасцю глытае паветра, лічачы сябе шчаслівчыкам: астатнія людзі пакутуюць ад спёкі. Праўда, гэтае гарадское паветра — сумесь з пылам і выхлапнымі газамі. Але свежы ветрык зараз — сапраўдны збавіцель. Выняўшы з кішэні насоўку, Віктар праводзіць ёю па лбе і шыі. І — раптам чуе:

— Вы, мабыць, хочаце прысесці, малады чалавек?

Іжэвіч паварочвае галаву і бачыць каля акна хударлявага старога ў шэрым пінжаку і светлай у палоску кашулі. Адразу чамусьці кінуліся ў вочы ўскудлачаныя пасмы сівых валасоў — якраз гэта не ўвязвалася з вобразам акуратнага пажылога чалавека, якому, на думку Віктара, было за 80. «Да каго ж гэта ён звяртаецца? — Іжэвіч азірнуўся і раптам заўважыў, што стары глядзіць якраз на яго. — Няўжо да мяне?..»

— Я да вас звяртаюся, малады чалавек, — ён і сапраўды ўважліва глядзеў Іжэвічу ў вочы. — Мабыць, усё ж такі хочаце прысесці?

Віктар не адразу адказаў, проста аслупянеўшы ад яго слоў: пажылы чалавек уступае яму сваё месца... Чаму? Ці ён настолькі дрэнна выглядае? Парадокс...

— Шчыра кажучы, вы дрэнна выглядаеце, — нібыта адказаў на яго пытанне стары.

— Не, дзякуй вялікі. Я пастаю, — нарэшце выціснуў ён з сябе. — Дзякуй...

Наступныя словы старога ўвогуле ашаламілі Іжэвіча.

— А скажыце, малады чалавек, вам кардыёлаг ніколі не гаварыў аб тым, што ў вас хворае сэрца?..

У гэты ж момант «рогі»-токапрыёмнікі тралейбуса зляцелі з правадоў — і той, нібыта наляцеўшы на нейкую нябачную перашкоду, рэзка спыніўся...

### 2

— Добра, што своечасова выклікалі. Некалькі дзён на бальнічным, а потым — на поўнае абследаванне...

І ўрач «хуткай» з чырвонымі ад бяссоннай ночы вачыма зачыніў за сабой дзверы.

У Віктара ўсё ўнутры калацілася: у яго Алесі раптам нешта з сэрцам! Ім толькі па сорак. Здавалася, жыццё толькі пачынаецца, але глядзі ж ты... Доктар сказаў, што далей прыйдзецца жыць на таблетках. Ён не мог паверыць.

— Віця, дай папіць, — ціха папрасіла жонка, але ён пачуў. Кінуўся на кухню, наліў вады, прынёс. Прыўзняў галаву Алесі з падушкі. Дапамог напіцца. Тая падзякавала яму. З палёгкай. Заплюшчыла вочы...

Ён доўга глядзеў на яе. Правёў рукою па яе прыгожых чорных валасах. Потым узяў яе руку ў сваю. Намацаў пульс. Падлічыў. Сумна ўздыхнуў. Хоць крызіс і мінуў, але Віктар не хацеў адпускаць гэтую руку, баючыся, што ўсё вернецца зноў: і боль, і шалёная тахтанне сэрца — такое, што жыла на шыі хадзіла ходырам... І страх — халодны, ліпкі... Боязь страціць яе, адну-адзіную, якую кахаў...

♦♦♦

...«Ацi кахаю я яе?» — усё часцей прыходзіла крадком думка, якую Іжэвіч адразу ж гнаў ад сябе. Вядома ж, кахае: столькі гадоў разам... Ніколі «налева» не хадзіў. Усё, як гаворыць, нёс у хату.

«І калі табе ў тваім інстытуце зарплату павысяць?» — часта пыталася Алеся ў Віктара. Як быццам у сябе самой пыталася, таму што ведала адказ. І, як заўсёды, у іх, Іжэвічаў, размовах утваралася замкнёнае кола. «А навошта тады, скажы, два ўніверсітэты заканчваць, навукай займацца, над уласнымі рукапісамі карпець, калі можна вартаўніком атрымліваць столькі ж, а?» — Алеся нервова гартала газету з аб'явамі. — Ці я чагосьці не цямлю?»

Яна «заводзілася» з паўабароту, калі размова ішла пра прыбытак. Віктар разумеў яе, але ўздыхаў: з яго дыпломамі ён кар'еры ў той жа камерцыі зрабіць не зможа. Але ж ён — інтэлігентны чалавек, навуковец!

«У нас сын расце, вучыцца платна — падумаў бы пра яго!» — працягвала Алеся. І атмасфера накалялася, як заўсёды. Потым ішлі ўспаміны пра кватэру, якая ўжо колькі гадоў без рамонту, пра гардэроб, які ўжо даўно не абнаўляўся, і зноў пра грошы... Неўзабаве Алеся прыгадвала сваіх сябровак, якім «больш пашчасціла»... Іжэвіч разумеў, што такія размовы рэгулярна вядуцца ці не ў кожнай сям'і, ды і выйсце, здавалася, было зусім ужо блізка: «залатога» піянерскага правіла «Пачні з сябе» яшчэ ніхто не адмяняў. Але нешта «пачынаць з сябе» ў сорак гадоў, калі шмат чаго зроблена ў жыцці, не хацелася... Ён знайшоў сабе некалькі падпрацовак, але грошай усё роўна катастрафічна не хапала.

Алеся, у сваю чаргу, у сваёй кар'еры таго-сяго дабілася — працавала начальнікам аддзела. Здавалася, стала трохі лягчэй. Але зноў пайшла «цёмная паласа», ды і плату за вучобу сына павысілі. У чарговы раз вярнуўшыся з бухгалтэрыі, Іжэвіч сеў за стол, падлічыў іх з Алесяй бюджэт і зразумеў: трэба нешта рабіць. Ён ведаў што— шукаць новую працу. І зноў перад вачыма ўсплыў знаёмы дэвіз: «Пачні з сябе...» Але як?..

І вось праз пару дзён, калі Алеся пасля працы вярнулася дадому, Іжэвіч заўважыў, што яна выглядала разгубленай.

— Ты ведаеш,— амаль з парога вымавіла яна, — мне прапанавалі перайсці на іншую працу. Памятаеш, я месяц таму гаварыла, што такое можа здарыцца?

Віктар кіўнуў, не асмельваючыся сказаць Алесі пра вынікі сваіх разлікаў. А яна працягвала:

— І зарплату добрую абяцалі...

Падышла да яго, шапнула ў самае вуха... Ён, пачуўшы гэта, уражаны, не вымавіў ні слова: усё магло змяніцца ў лепшы бок...

—...Але і нагрузка ў мяне будзе, напэўна, такая, што начаваць у офісе прыйдзецца...

Іжэвіч разумеў: усё адбываецца не так, як патрэбна. Гэта ён павінен быў прыйсці дадому з такой весткай. Гэта ён павінен быў адшукаць працу, каб забяспечыць сям'ю. Гэта ж ён мужчына... Сэрца яго затахтала так, што, здавалася, выскачыць зараз. Ён зразумеў усё: калі нешта не зменіцца, ён страціць і яе, як жонку і самага блізкага чалавека, і сябе для яе...

Нічога не адбылося, і неўзабаве Алеся з галавою акунулася ў новую працу. Знайшліся грошы, каб аплаціць вучобу, каб заткнуць некаторыя прарэхі ў бюджэце. Але нешта не заладзілася ў іх з жонкаю. І дагэтуль занятыя, яны цяпер зусім аддаліліся адно ад аднаго...

Віктар, каб здабыць лішнюю капейку, стаў працаваць і ў выхадныя. Хаця добра ведаў, што гэта таксама не выйсце: афіцыйна цяпер ён зарабляў менш за Алесю. А тая, каб хоць на нейкі час забыцца пра работу, сядзела ў інтэрнэце. Завяла сабе новых сябровак, сяброў і магла гадзінамі размаўляць з імі па скайпе.

У кожнага з іх пачалося сваё жыццё... Неўзабаве Алеся засталася начаваць у тым пакоі, дзе стаяў камп'ютар. Раз, другі, трэці. Ён змагаўся. Нават, аднойчы засекчушы яе ў пакоі, вырваў провад з мадэмам. А яна пакрыўдзілася. І — перасялілася ў гэты пакой...

А потым, праз некалькі дзён... Дзве гадзіны ночы. Сардэчны прыступ. «Хуткая». І — амаль упершыню з «таго» часу — яе рука ў яго руцэ...

♦♦♦

...Штосьці шчоўкнула, і тралейбус, як вялікі кот, завуркатаў, рушыў з месца. Увесь гэты час Іжэвіч у роздуме стаяў каля акна. Ён думаў, што прайшла цэлая гадзіна, хаця мінула ўсяго некалькі хвілін. За гэты час перад вачыма прамільгнула амаль цэлае жыццё, падумалася яму.

— Дык кардыёлаг гаварыў вам, што ў вас хворае сэрца? — зноў пачуў Віктар голас старога.

У гэты час вадзіцель абвясціў: «Дом друку!» Тралейбус спыніўся. Дзверы расчыніліся. Іжэвіч павярнуўся да старога.

— Вы ведаеце, мне няма часу хадзіць па ўрачах — працаваць трэба... Жыць трэба... Усяго добрага! — адказаў ён і выйшаў на вуліцу...


19 августа 2013 г. в 10.30 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Брестский КСМ».

Повестка дня:

1. О совершении сделок Общества.
2. Об утверждении Решения о выпуске облигаций.

Местонахождение ОАО «Брестский КСМ»: г. Брест, ул. Гоздецкого, 28.

Место проведения собрания: г. Брест, ул. Гоздецкого, 28.

Время регистрации в день проведения собрания с 10.00 до 10.30.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера — доверенность).

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 12.08.2013 г. (с 10.00 до 16.00) по месту нахождения Общества.

Совет директоров.

УНП 200295903



***ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ***

**«Многоквартирные жилые дома в районе пересечения ул. Васнецова, Плеханова в г. Минске». 1-я очередь строительства,**

*опубликованную в газете «Звязда» №98 за 30.05.2013 года*

Застройщик – иностранное частное унитарное строительное предприятие «Атлант-М Строй» компании «Интеркар Холдинг ЛЛС», доводит до сведения заинтересованных лиц о внесении изменений в проектную декларацию «Многоквартирные жилые дома в районе пересечения ул. Васнецова, Плеханова в г. Минске». 1-я очередь строительства (опубликованную в газете «Звязда» № 97 за 30.05.2013 года).

В разделе **«Цена объекта долевого строительства»** абзац первый заменить абзацем следующего содержания:

В соответствии с Указом Президента Республики Беларусь №396 от 15.06.2006 г. (с изменениями) «О долевом строительстве многоквартирных жилых домов» для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, предлагается для заключения договоров долевого строительства 50 квартир (1-, 2-комнатные) стоимостью 1700 (тысяча семьсот) долларов США за 1 кв.м. В зависимости от типа квартир, размера первоначального взноса и сроков внесения последующих платежей применима гибкая система скидок.

Раздел **«Порядок приема заявлений от граждан, желающих принять участие в долевом строительстве квартир»** дополнить абзацем следующего содержания:

Прием заявлений от граждан, не нуждающихся в улучшении жилищных условий, осуществляется в приемной ИП «Атлант-М Строй» (г. Минск, пер. Козлова, 7Б, правое крыло, 2 этаж, тел. 297 94 70) с 14 августа 2013 г. УНП 800005787



**УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ**

**ОАО «Стройтрест № 1» уведомляет о том, что выплата дивидендов за 1-е полугодие 2013 года будет осуществляться с 20 августа 2013 г. по 20 сентября 2013 года почтовыми переводами через РУП «Белпочта».**

Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги), — 4743,51 рубля.

УНП 100288960 *Наблюдательный совет*



**ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ**

| | |
|---|---|
| **Наименование (описание) и стоимость имущества** | **Лот № 1.** Изолированное помещение, инв. № 200/D-141307, расположенное по адресу: г. Витебск, Гагарина, 4-1В, площадью 92,7 кв м, наименование – многофункциональное помещение, назначение – многофункциональное помещение. Первоначальная стоимость – 213 651 600 белорусских рублей. **Лот № 2.** Изолированное помещение, инв. №200/D-140056, расположенное по адресу: г. Витебск, Гагарина, 4-1, площадью 94,8 кв.м, наименование – производственное помещение, назначение – производственное помещение. Первоначальная стоимость – 647 304 000 белорусских рублей. |
| **Собственник (владелец) имущества** | ОАО «Витебский приборостроительный завод» |
| **Местонахождение (адрес) имущества** | г. Витебск, ул. Гагарина, д. 4-1 |
| **Информация об обременениях** | Аренда |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | г. Витебск, ул. «Правды», 32<br>16 сентября 2013 года в 11.30 |
| **Справочная информация** | Хозяйственный суд Витебской области<br>210101, г. Витебск,<br>ул. «Правды», д. 32, каб. 304<br>http://court.gov.by<br>Судебный исполнитель<br>Железовский Юрий Александрович,<br>тел./факс (80212) 49 13 41,<br>(8 029) 366 40 11<br>Старший судебный исполнитель<br>Зуев Михаил Евгеньевич,<br>тел. (80212) 49 13 40 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет хозяйственного суда Витебской области № 3642903002094 в филиале № 200 Витебского областного управления ОАО СБ «Беларусбанк», код 635, УНП 300007670, не позднее 15.09.2013. Минимальная величина первого шага – 5% стоимости каждого лота.<br>В соответствии с ч. 3 ст. 401 ХПК Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. |

## РУП «ЖИЛКОММУНТЕХНИКА» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ СОБСТВЕННОСТИ ОАО «БРЕСТМАШ»

| Номер лота | ЛОТ № 1 | ЛОТ № 2 |
|---|---|---|
| Наименование объекта | Изолированное помещение (инв. №100/D-101457), общ. пл. 679,8 м$^2$ – административное помещение | Изолированное помещение (инв. №100/D-101459), общ. пл. 11,2 м$^2$ – административное помещение |
| Местонахождение объекта | г. Брест, ул. Суворова, 21В-1 | г. Брест, ул. Суворова, 21В-3 |
| Начальная цена продажи, руб. без НДС | 1 495 722 000 | 54 128 000 |
| Размер задатка, руб | 149 572 200 | 5 412 800 |
| Право на земельный участок | право постоянного пользования | право постоянного пользования |
| Условия продажи | имущество обременено арендой до марта 2015 года | имущество обременено арендой до июля 2017 года |
| Продавец (Балансодержатель) | ОАО «Брестмаш» | |
| Организатор торгов | РУП «Жилкоммунтехника» Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» Брестское областное управление | |
| Срок заключения договора купли-продажи | В течение 5-и рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона | |
| Условия оплаты | Оплата в течение 5 банковских дней с момента заключения договора | |
| Номер р/с для перечисления задатка | р/с 3012105618108 руб. РБ в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк» по г. Минску, код 153001369, УНП 102353509 | |
| **Аукцион состоится 14 августа 2013 г. в 11.00 (лот № 1); 11.15 (лот № 2) по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325, Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»** | | |

**Для участия в аукционе необходимо предоставить:**

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение о правах и обязанностях с Филиалом «Центр «Белтехинвентаризация».

2. Заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка на расчетный счет организатора торгов.

3. Юридическим лицам – резидентам Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица; представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).

4. Юридическим лицам – нерезидентам Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе); представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).

5. Индивидуальным предпринимателям – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; представителю индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).

6. Физическим лицам – представителю физического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.

7. При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

** Участник аукциона, выигравший торги, оплачивает продавцу НДС в размере 20% от продажной цены объекта, стоимость затрат на организацию и проведение аукционных торгов Поверенному.*

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, каб. 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00.**
**Последний день приема заявлений – 13 августа 2013 г. до 17.00.**
**Контактные тел.: 8 (0162) 23 92 59, 21 88 81.**

## РУП «ЖИЛКОММУНТЕХНИКА» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ СОБСТВЕННОСТИ ОАО «ЖЕЛДОРСЕРВИС»

| Номер лота | ЛОТ № 1 |
|---|---|
| Наименование объекта | 1. Капитальное строение (инв. № 100/С-48026) – овощехранилище, база № 2, в состав входят: здание овощехранилища, общ. пл. 392 м$^2$, навес, пл. 15 м$^2$, асфальтобетонное покрытие, пл. 1187,3 м$^2$, кабельная линия АВВГ 2х6, протяж 20 м.п., водопроводная стальная сеть, протяж. 19 м.п., металлические ворота, протяж. 10,9 м$^2$, кирпичный забор, протяж. 50,5 м.п., металлические ворота, пл. 12,0 м$^2$, металлические ворота, пл. 12,44 м$^2$. 2. Капитальное строение (инв. №100/С-48028) – засолочный пункт, база № 2, общ. пл. 196,6 м$^2$. 3. Капитальное строение (инв. №100/С-48029) – тарный склад, база № 2, общ. пл. 258,0 м$^2$. 4. Дерево «Клен», 1989 г. посадки, диаметр 32 см. |
| Местонахождение объекта | г. Брест, пер. 1 Мая, 7 |
| Начальная цена продажи, руб. без НДС | 1 129 263 000 |
| Размер задатка, руб | 112 926 300 |
| Право на земельный участок | право постоянного пользования; 0,2466 га |
| Условия продажи | без условий |
| Продавец (Балансодержатель) | ОАО «Желдорсервис» |
| Организатор торгов | РУП «Жилкоммунтехника» Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» Брестское областное управление |
| Срок заключения договора купли-продажи | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| Условия оплаты | Оплата производится в соответствии с заключенным договором купли-продажи |
| Номер р/с для перечисления задатка | р/с 3012105618108 руб. РБ в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк» по г. Минску, код 153001369, УНП 102353509 |
| **Аукцион состоится 10 сентября 2013 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325 Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»** | |

**Для участия в аукционе необходимо предоставить:**

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение о правах и обязанностях с Филиалом «Центр «Белтехинвентаризация».

2. Заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка на расчетный счет организатора торгов.

3. Юридическим лицам – резидентам Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица; представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).

4. Юридическим лицам – нерезидентам Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе); представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).

5. Индивидуальным предпринимателям – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; представителю индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).

6. Физическим лицам – представителю физического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.

7. При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

** Участник аукциона, выигравший торги, оплачивает продавцу НДС в размере 20% от продажной цены объекта, стоимость затрат на организацию и проведение аукционных торгов Поверенному.*

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, каб. 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00.**
**Последний день приема заявлений – 09 сентября 2013 г. до 17.00.**
**Контактные тел.: 8 (0162) 23 92 59, 21 88 81.**

## Открытое акционерное общество «Строительный трест № 4»

**СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ВНЕОЧЕРЕДНОГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ ОАО «Стройтрест № 4».**
**Собрание состоится 22 августа 2013 года в 15.00**
**по адресу: г. Минск, ул. Коммунистическая, 17, актовый зал**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**
1. О начислении и выплате дивидендов за 1 полугодие 2013 года.

УНП 100055368

Регистрация участников собрания проводится с 14.00 до 14.45 по предъявлении паспорта, а представителей акционеров – по доверенности.

Списки акционеров ОАО «Стройтрест № 4» для регистрации участников собрания будут составлены по данным реестра акционеров на 10 августа 2013 года.

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни (понедельник–пятница), начиная с 14 по 21 августа 2013 г. с 9.00 до 17.00 с перерывом с 13.00 до 14.00, 22 августа 2013 года с 9.00 до 13.00 по адресу: г. Минск, ул. Коммунистическая, 17, каб. 302.

Справки по тел. в г. Минске: 334 10 03.

*Наблюдательный совет*

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 12 сентября 2013 года проводит 17-ый открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности

| Лот | Наименование техники | Местонахождение объекта | Начальная цена продажи (бел. руб.) | Сумма задатка, (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|
| 367 | Шасси УРАЛ-375А ш. 236445 дв. 352472 1977 г. 4 кат 2875 км 80,5 м/ч | г. Осиповичи, в/ч 01313 | 30 000 000 | 3 000 000 |
| 368 | Шасси УРАЛ-375А ш. 242968 дв. 411111 1977 г. 4 кат 1991 км 5,75 м/ч | г. Осиповичи, в/ч 01313 | 30 000 000 | 3 000 000 |
| 369 | Шнекороторный снегоочиститель ДЭ-210А № 870249 на ЗиЛ-131Н ш. 725949 двиг. с/о У1Д6 № 8603и274 1987 г. 3 кат. 5 388 км 789 м/ч | г. Берёза, в/ч 23324 | 50 000 000 | 5 000 000 |
| 370 | Мастерская ПМ-2-70 № К351016 1989 г. 2 кат. в составе: – МРМ-М1 № 033 на ЗИЛ-131 1988 г. ш. 755529 дв. 933087 – МРС-АР № А531 на ЗИЛ-131 1988 г. ш. 806201 дв. 172085 – ТА-5М № К351016 на ЗИЛ-131 1989 г. ш. 0927068 дв. 762386 с ЭСБ-4-ВЗ-1-М1 №АК23608004 – АДБ-3120У1 № 798 на пр.1-П-2,5 1982 г. ш. 1609 | г. Минск, в/ч 63755 | 120 000 000 | 12 000 000 |
| 371 | Мастерская ПМ-2-70 № Р35135 1985 г. 2 кат. в составе: – МРМ-М1 № 093 на ЗИЛ-131 1984 г. ш. 585952 дв. 133722 – МРС-АР № 57 на ЗИЛ-131 1985 г. ш. 636891 дв. 379892 – ТА-5 № Р35135 на ЗИЛ-131 1984 г. ш. 582993 дв. 122038 – ЭСБ-4-ВЗ-1-М1 №ТИ23628360 на пр.1-П-1,5 1983 г. ш. 201449 – АДБ-3120У1 № 14023 на пр.1-П-2,5 1983 г. ш. 0361Т | г. Минск, в/ч 63755 | 105 000 000 | 10 500 000 |
| 372 | Мастерская ПМ-2-70 № Т35143 1986 г. 2 кат. в составе: – МРМ-М1 № 039 на ЗИЛ-131 1986 г. ш. 671695 дв. 545578 – МРС-АР № 0068 на ЗИЛ-131 1986 г. ш. 655666 дв. 458332 – ТА-5 № Т35143 на ЗИЛ-131 1986 г. ш. 0916839 дв. 711253 с ЭСБ-4-ВЗ-1-М1 №УД23601148 – АДБ-3120У1 № 16319 на пр.1-П-2,5 1986г. ш.К0000104 | г. Минск, в/ч 63755 | 120 000 000 | 12 000 000 |
| 373 | Мастерская ремонтная слесарная МРС-АР № 74070 на ЗИЛ-131 ш. 246228 дв. 356794 1974 г. 4 кат. 351 км | г. Минск, в/ч 63755 | 40 000 000 | 4 000 000 |
| 374 | Грузовой КамАЗ-43101 ш. 0002760 дв.0515461 1989 г. 4 кат. 175748 км | г. Полоцк, в/ч 55719 | 50 000 000 | 5 000 000 |
| 375 | Грузовой КрАЗ-260 ш. КО650019 дв. 19301 1989 г. 3 кат. 142947 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 60 000 000 | 6 000 000 |
| 376 | Грузовой Урал-4320-0011-01 ш. 148048 дв. 583163 1990 г. 3 кат. 83 930 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 55 000 000 | 5 500 000 |
| 377 | Грузовой Урал-4320-0011-01 ш. 147198 дв. 603069 1990 г. 3 кат. 83 375 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 55 000 000 | 5 500 000 |
| 378 | Мастерская МРМ-М1 без номера на ЗИЛ-131Н ш. КО866512 дв. 460744 1989 г. 4 кат. 4 552 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 50 000 000 | 5 000 000 |
| 379 | Гусеничное шасси МТ-ЛБ ш. 68901008 дв. 8850317 1989 г. 4 кат. 701 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 100 000 000 | 10 000 000 |
| 380 | Гусеничное шасси МТ-ЛБ ш. 68902004 дв. 8846874 1989 г. 4 кат. 808 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 100 000 000 | 10 000 000 |
| 381 | Гусеничное шасси МТ-ЛБ ш. 68806004 дв. 8815940 1988 г. 4 кат. 1071 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 100 000 000 | 10 000 000 |
| 382 | Гусеничное шасси МТ-ЛБ ш. 68812005 дв. 8840668 1988 г. 4 кат. 791 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 100 000 000 | 10 000 000 |
| 383 | Гусеничное шасси МТ-ЛБ ш. 68902005 дв. 8853791 1989 г. 4 кат. 533 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 100 000 000 | 10 000 000 |
| 384 | Гусеничное шасси МТ-ЛБ ш. 68812004 дв. 8840560 1988 г. 4 кат. 1300 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 100 000 000 | 10 000 000 |
| 385 | Гусеничный тягач МТ-ЛБ ш. 110098002 дв. 550814 1980 г. 4 кат. 1 213 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 100 000 000 | 10 000 000 |
| 386 | Гусеничный тягач МТ-ЛБ ш. 110128084 дв. 085915 1988 г. 4 кат. 684 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 100 000 000 | 10 000 000 |
| 387 | Гусеничный тягач МТ-ЛБ ш. 110088002 дв. 552939 1980 г. 4 кат. 1 802 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 100 000 000 | 10 000 000 |
| 388 | Гусеничный тягач МТ-ЛБ ш. 110187181 дв. 487698 1978 г. 4 кат. 480 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 100 000 000 | 10 000 000 |
| 389 | Гусеничный тягач МТ-ЛБ ш. без номера дв. 8835763 1983 г. 4 кат. 569 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 100 000 000 | 10 000 000 |
| 390 | Гусеничный тягач МТ-ЛБ ш. 68711022Б дв. 064827 1987 г. 4 кат. 4 348 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 100 000 000 | 10 000 000 |
| 391 | Гусеничный тягач МТ-ЛБ ш. 68711001Б дв. 053749 1987 г. 4 кат. 1 877 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 110 000 000 | 11 000 000 |
| 392 | Гусеничный тягач МТ-ЛБ ш. 68711024Б дв. 065307 1987 г. 4 кат. 1 864 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 110 000 000 | 11 000 000 |
| 393 | Гусеничный тягач МТ-ЛБ ш. 68210022Б дв. 758709 1988 г. 4 кат. 854 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 110 000 000 | 11 000 000 |
| 394 | Гусеничный тягач МТ-ЛБ ш.110158003 дв. 553076 1980 г. 4 кат. 1949 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 100 000 000 | 10 000 000 |
| 395 | Гусеничный тягач МТ-ЛБ ш.110057087 дв. 488045 1978 г. 4 кат. 606 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 100 000 000 | 10 000 000 |
| 396 | Гусеничный тягач МТ-ЛБ ш. 68412208Б дв. 230604 1984 г. 4 кат. 2278 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 100 000 000 | 10 000 000 |
| 397 | Гусеничный тягач МТ-ЛБ ш. 68410210Б дв. 873454 1984 г. 4 кат. 1295 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 100 000 000 | 10 000 000 |
| 398 | Гусеничный тягач МТ-ЛБ ш. 110107192 дв. 001023 1979 г. 4 кат. 1387 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 100 000 000 | 10 000 000 |
| 399 | Гусеничное шасси МТ-Лбу ш. 107911032 дв. 601925 1979 г. 4 кат. 454 км – имеет остаточную стоимость 91 114 710 белорусских рубля, гусеничное шасси МТ-Лбу ш. 107910010 дв.598152 1979 г. 4кат. 1145 км, гусеничное шасси МТ-Лбу ш. 107912002 дв. 607871 1979 г. 4 кат. 4870 км, гусеничное шасси МТ-Лбу ш. 107905018 дв. 569791 1979 г. 4 кат. 4147 км. Партия 4 штуки | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 800 000 000 | 80 000 000 |

**Аукцион** состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж **12 сентября 2013 г. в 11.00.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток и подавшие заявление на участие в аукционе, учредительские и другие необходимые документы до **16.00 9 сентября 2013 года**.

**Победитель аукциона обязан:**
1. Заключить договор купли-продажи не позднее 3-х дней с момента проведения аукциона.
2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение **5**-ти банковских дней для резидентов Республики Беларусь и **10**-ти банковских дней для нерезидентов Республики Беларусь со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток и денежные средства победителем лота перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: 3012107883029, в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, УНП 101099370, БИК 153001369. **Без НДС**.

**Справки по тел.: (017) 398 07 81, факс (017) 398 07 81.**

**Наш адрес в интернете: www.belspeckontrakt.by.**

■ Захапленні

# З ВЕТРЫКАМ!





**У сталіцы прайшло галоўнае свята скутарыстаў краіны Fashion Scooter Fest.**

Некалькі гадоў таму каля 150 скутарыстаў у незвычайных строях выехалі на вуліцы Мінска, каб прыцягнуць увагу да сваіх транспартных сродкаў. Гэтая падзея настолькі спадабалася кіроўцам двухколавай тэхнікі, што яны вырашылі ператварыць фэст у своеасаблівую традыцыю.

Сёлета вялікая калона скутарыстаў стартавала ад прадпрыемства «Мотавела» па Партызанскім праспекце і прыбыла ў парк імя Горкага. Надвор'е ў гэты дзень падрыхтавала шмат сюрпрызаў, але некаторыя ўсё ж адважыліся прыехаць да месца збору ў дзелавых строях і нават стылізаваных касцюмах.

Па меркаванні арганізатараў фестывалю, галоўная мэта правядзення Fashion Scooter Fest — паказаць, што скутар не толькі паўнапраўны ўдзельнік дарожнага руху, але і самы крэатыўны і зручны спосаб перамяшчэння па гарадскіх вуліцах.

**Марына БЕГУНКОВА,**
**фота аўтара.**

# СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.34 | 20.56 | 15.22 |
| Віцебск — | 5.18 | 20.50 | 15.32 |
| Магілёў — | 5.24 | 20.46 | 15.22 |
| Гомель — | 5.26 | 20.37 | 15.11 |
| Гродна — | 5.50 | 21.10 | 15.20 |
| Брэст — | 5.56 | 21.05 | 15.09 |

## Месяц

*Маладзік у 0.51.*
*Месяц у сузор'і Льва.*

## Імяніны

**Пр.** *Алімпіяды, Ганны, Іраіды, Аляксандра, Макара.*
**К.** *Дароты, Клаўдзіі, Кандрата, Каятана, Сікста.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




■ Запрашальнік

## ФЕСТЫВАЛЬ «МОТАЛЬСКІЯ ПРЫСМАКІ» ПАЧНЕЦЦА ЎРАЧЫСТАЙ СЛУЖБАЙ І ХРЭСНЫМ ХОДАМ

**Штогадовы міжнародны фестываль «Мотальскія прысмакі» ў Іванаўскім раёне на гэты раз пройдзе пад знакам 1025-годдзя Хрышчэння Русі. Свята распачнецца 10 жніўня ўрачыстай службай у Спаса-Праабражэнскай царкве вёскі Моталь. Пасля літургіі вернікі і госці пройдуць хрэсным ходам на цэнтральную плошчу.**

Як заўсёды, будуць разгорнуты «смачныя падворкі» розных аграгарадкоў і сельсаветаў. У праграме — конкурс-дэгустацыя «Парады бабуль — майстэрства ўнукаў», майстар-класы кулінараў Беларусі і замежжа. Мотальскі музей народнай творчасці запросіць на адкрыццё свайго археалагічнага філіяла. І, безумоўна, будзе працаваць процьма пляцовак па гандлі ўсялякімі прысмакамі кшталту «Усе ласы на мотальскія каўбасы» або «Мотальскія караваі на ўсе густы выбіраем». А яшчэ чакаецца шмат музыкі, песень і танцаў. Маталяне чакаюць гасцей.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## УСМІХНЕМСЯ

Жонка і муж.
— Дарагі, мне якую сукенку апрануць? Гэту ці вось гэту?
Муж (не адрываючыся ад газеты):
— Дык абедзве нічога.
— А я не хачу выглядаць «нічога». Я хачу выглядаць захапляльна!
— Ну тады апрані адразу абедзве. Будзе захапляльна!

***Жонка сіноптыка верыла свайму мужу максімум на тры дні наперад.***

Дзеці ў садку:
— А мяне бусел прынёс!
— А мяне з інтэрнэту спампавалі!
— А ў нас сям'я бедная, тата сам усё робіць!




caricatura.ru

■ Ну і ну!

## НА ТОК-ШОУ ПАДАРЫЛІ НЕМАЎЛЯТ

Амір Ліякат Хусейн з'яўляецца вядучым папулярнага пакістанскага ток-шоу, у час якога ён ладзіць розныя конкурсы. За правільны адказ гледачы атрымліваюць матацыклы, мабільныя тэлефоны і іншыя прызы. Нядаўна пакістанскія тэлеканалы пачалі актыўна змагацца за рэйтынгі, жадаючы прыцягнуць як мага больш гледачоў. Амір Хусейн у чарговым выпуску свайго ток-шоу пайшоў на беспрэцэдэнтны крок, уручыўшы двум гледачам, якія перамаглі ў конкурсе, немаўлят (!). Сем'і, якія атрымалі дзяцей у якасці «прыза», прайшлі ўсе неабходныя для ўсынаўлення працэдуры да ток-шоу, якое стала арыгінальнай цырымоніяй па перадачы немаўлят новым бацькам. У сваю чаргу, для новаспечаных бацькоў «прыз» стаў такой жа нечаканасцю, як і для ўсіх астатніх гледачоў. Нягледзячы на тое, што грамадскасць асуддзіла новаўвядзенне Аміра Хусейна, тэлевядучы мае намер працягнуць гэтую практыку. Больш за тое, ён звярнуўся да бедных жыхароў Пакістана, якія маюць намер адмовіцца ад сваіх нованароджаных дзяцей, каб яны перадавалі немаўлят яму, а ён знойдзе ім новую сям'ю праз сваё тэлешоу.

Даты | Падзеі | Людзі

**1910** год — нарадзіўся (вёска Новы Пагост, цяпер Мёрскі раён) Генадзь Іванавіч Цітовіч, беларускі этнамузыказнаўца, дзеяч харавога мастацтва, дырыжор, народны артыст Беларусі (1955), народны артыст СССР (1968). У 1939 годзе скончыў Віленскую кансерваторыю, у 1936—1939 гадах вывучаў этнаграфію ў Віленскім універсітэце. У 1939-м арганізаваў і ўзначаліў аматарскі Падлескі народны хор у Ляхавіцкім раёне. З 1952 года — арганізатар і мастацкі кіраўнік Дзяржаўнага акадэмічнага народнага хору (цяпер носіць яго імя). Збіраў і вывучаў беларускі музычны фальклор. У розных раёнах Беларусі запісаў каля 3000 народных песень і танцаў. У навуковых працах даследаваў музычную творчасць славянскіх народаў, беларускае народнае шматгалоссе, народнае выканальніцтва, стылі сучаснай народнай песні. Аўтар песень на ўласныя словы і вершы беларускіх паэтаў, больш як 60 апрацовак беларускіх народных мелодый («Рэчанька», «Жавароначкі, прыляціце», «Ой, рана на Івана» і інш.). Музычны рэдактар тамоў «Радзінная паэзія», «Жартоўныя песні», шматтомнага выдання «Беларуская народная творчасць», аўтар тэле-і радыёперадач. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1978), прэміі Ленінскага камсамола Беларусі (1968). Памёр у 1986 годзе.



**1958** год — нарадзіўся (горад Мінск) Віктар Сяргеевіч Манаеў, беларускі акцёр, заслужаны артыст Беларусі (1997), народны артыст Беларусі (2011). З 1980 года — у Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Я. Купалы. Выканаўца лірычных, драматычных, трагікамедыйных роляў. Сярод роляў: Адуванчык («Радавыя» А. Дударава), Мікіта Зносак («Тутэйшыя» Я. Купалы), Жадаў («Даходнае месца» А. Астроўскага). Здымаўся ў фільмах «Людзі на балоце», «Подых навальніцы», «Давай пажэнімся!» і іншых. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1985), Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1992), прэміі Ленінскага камсамола Беларусі (1985).

**1983** год — 30 гадоў таму была прынята пастанова ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб умацаванні сацыялістычнай працоўнай дысцыпліны», якая прадугледжвала пакаранне за выпуск браку, прагулы і спазненні на работу, п'янства на працоўным месцы. Самымі характэрнымі прыкладамі яе ажыццяўлення, якія сталі прыметай андропаўскага часу, былі масавыя аблавы на наведвальнікаў крам, кінатэатраў, цырульняў, лазняў у дзённы час.

## Было сказана

**Уладзімір КАРАТКЕВІЧ, паэт, празаік, драматург, публіцыст, перакладчык, кінасцэнарыст:**

*«Сярод тых, каго хвалю, могуць апынуцца асабістыя мае ворагі (значыць, абставіны не дазволілі нам зведаць цану адно аднаму), а сярод тых, каго лаю, — сябры (значыць, прыкідваліся са мною або ненарокам, пад настрой, ляпнулі нечуваную дурасць). Але я тут хвалю не іх, а правільную думку, лаю не іх, а думку, ад якой на хвіліну не хочацца належаць да чалавечай грамады. І я раблю гэта не ананімна, так што хай ведаюць».*


ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), В. КЛЮЧНІК (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (першы намеснік дырэктара—галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.



Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.



http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by



Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.



Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 22.941. Індэкс 63850. Зак. № 3458.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 6 жніўня 2013 года.